

БЫЦЬ «ПЕРШЫМІ» – БЫЦЬ НАПЕРАДЗЕ ЎСІХ

ЧЫРВОНКА

АНЛАЙН ШТОДНЯ

ЧЫРВОНКА




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

1 КАСТРЫЧНІКА 2020 г. ЧАЦВЕР № 191 (29305)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Валянцін СЕМЯНЯКА, старшыня Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу:**

*«Цяпер у Палаце прадстаўнікоў знаходзіцца 43 законапраекты. З іх 33 уключаны ў прыкладны графік разгляду на сесіі. Салідны блок пытанняў датычыцца рэгулявання эканомікі, навуковай, навукова-тэхнічнай, інавацыйнай дзейнасці. У адпаведнасці з даручэннем кіраўніка дзяржавы парламентам праведзена досыць сур'ёзная работа па падрыхтоўцы праектаў Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях і Працэсуальна-выканаўчага кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях». Работа над гэтымі кодэксамі набліжаецца да завяршэння. Практычна кожны дзень праходзяць пасяджэнні профільнай камісіі, на якіх разглядаюцца ўсе пункты гледжання. Спадзяёмся, што ў найбліжэйшы час гэтая работа завершыцца, і мы атрымаем праекты якасных кодэксаў».*

# Залаты сямейны ўраджай



Восень, кастрычнік, пачатак бабінага лета. У такую пару мне шанцуе на сустрэчы з цікавымі, больш за тое — шчаслівымі людзьмі. Шпацыруючы па вёсцы Тарасава Мінскага раёна, я назіраў, як сямейная пара дружна ўвіхалася каля садовага дрэва, ашчадна здымаючы чырвоныя яблыкі. З добрым настроем, весела гаспадары складвалі ў кошыкі спелую садавіну. І мне закарцела адчыніць брамку, бліжэй пазнаёміцца з імі. Віктар і Людміла ДРОБЫШЫ — так завуць маіх герояў — ветліва запрасілі на свой утульны і прыгожы падворак, пачаставалі налітымі сокам папяроўкамі, расказалі пра сёлетні ўраджай, які выдаўся надзіва шчодры, падзяліліся сакрэтамі доўгага сямейнага жыцця. Слова за словам — і я даведаўся, што Віктар Цімафеевіч амаль сорак гадоў працаваў у саўгасе «Ждановічы» слесарам па рамонце газавага прамысловага абсталявання, Людміла Аляксандраўна працавала ў сістэме гандлю. Калі яны выйшлі на заслужаны адпачынак, пабудавалі ў вёсцы свой дом і пераехалі сюды на сталае жыццё. А яшчэ Віктар і Людміла не прамінулі расказаць, што сёлета ў іх незвычайны год — пяцьдзясят гадоў сумеснага жыцця. Шчыра кажучы, я не адразу паверыў у гэты красамоўны біяграфічны факт — надта маладыя ў іх твары і юначыя агеньчыкі ў вачах. Я палічыў сваім абавязкам запрасіць іх папазіраваць, каб зрабіць «вясельны» партрэт на фоне раскошнай восені.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- **Выстаўка «Сцежкамі запаведнай прыроды», прымеркаваная да Года малой радзімы, адкрылася ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.**
- У Віцебскай вобласці рэалізуюць інавацыйны праект па стварэнні ІТ-класаў. Першыя чатыры такія з'явяцца ў гэтым годзе на базе пятых і дзясятых класаў ва ўстановах адукацыі абласнога цэнтра.
- **У аграгарадку Крошын Баранавіцкага раёна мужчына знайшоў у садзе два снарады часоў Вялікай Айчыннай вайны.**

Ведай свой край

# ІНТЭР'ЕР ДЛЯ ЭСТРАДНАЙ ЗОРКІ

**Глусчане сведчаць, што Філіп Кіркораў заказваў на іх фабрыцы дзверы**



Вольга БАЙКО дэманструе абсталяванне, якое зрабіла Глуск вядомым на ўвесь Савецкі Саюз.

**На жаль, канкрэтнага пацвярджэння гэтаму не захавалася, але ўсё можа быць. Менавіта ў Глуску існавала вядомая на ўвесь Савецкі Саюз фабрыка па вытворчасці мэблі. Тыя, чыя маладосць прыйшлася на пасляваенны перыяд, напэўна, памятаюць стыльныя канапы з драўлянымі спінкамі і круглымі падлакотнікамі. А шафы з люстэркамі яшчэ можна сустрэць у вясковых хатах. Зараз такой фабрыкі няма, але ёсць людзі, якія могуць згадаць гісторыю яе існавання.**

СТАР. 15

Эканамічны ракурс

# БОНУСЫ ІНІЦЫЯТЫЎНЫМ

**Якія інвестыцыі робяць перыферыю прывабнай для ўласнай справы**

**У беларуска-расійскім прыгранiччы ўсё больш грамадзян разумеюць, што ў нас можна добра зарабляць. І не трэба нікуды ехаць — на радзіме ёсць магчымасць не толькі ўладкавацца на працоўнае месца з параўнальна высокай аплатай, але і распачаць сваю справу. І можна гэта зрабіць без пазык і крэдытаў, адпаведна, даўгоў. Стаць прадпрымальнікам магчыма незалежна ад узросту і адукацыі. І дзеля гэтага трэба нямнога: жаданне, трохі інтуіцыі і цярпення — ды, бадай, і ўсё, каб штомесяц атрымліваць дастойныя сумы грошай.**

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Гэта форма работы дае станоўчы вынік»

**Сустрэчай з кіраўніком Бранскай вобласці Расіі завяршыўся «губернатарскі тыдзень» Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі.**

Кіраўнік беларускай дзяржавы заўсёды падкрэсліваў важнасць прамых рэгіянальных кантактаў паміж краінамі, і не толькі з Расіяй. Разам з тым камандзіроўкі расійскіх губернатараў у Мінск сталі лагічным працягам нядаўніх дамоўленасцяў паміж прэзідэнтамі дзвюх краін у Сочы.

Аляксандр Лукашэнка выказаў задаволенасць, што ў няпростых умовах пандэміі і абвастрэння міжнародных адносін па перыметры Саюзнай дзяржавы былі знойдзены шляхі ўзаемадзеяння паміж Беларуссю і Расіяй, якія прыносяць адчувальны эканамічны эфект абодвум бакам.

***«Таму Форум рэгіёнаў і ўвогуле гэта форма работы рэгіянальных лідараў, рэгіянальнага бізнесу з Беларуссю дае станоўчы вынік.*** Да гэтага мы больш чым на два мільярды долараў заключалі кантракты на такіх форумах, а на сёлетнім — амаль палову ад шасці папярэдніх. Добры рывок наперад», — ацаніў вынікі Форуму рэгіёнаў Прэзідэнт.

## «Мы думаем аднолькава, мы дзейнічаем аднолькава, у нас падобныя эканомікі»

Кіраўнік дзяржавы назваў Бранскую вобласць не проста суседам — вельмі сяброўскім для Беларусі рэгіёнам, дзе жывуць людзі, якія «абсалютна нічым не адрозніваюцца ад беларусаў».

«Гэта не тое, што блізкія, гэта адзін народ, абсалютна адзін, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Мы думаем аднолькава, мы дзейнічаем аднолькава, у нас падобныя эканомікі. Нюансы, яны заўсёды былі і будуць, але мы поўныя рашучасці іх вырашыць. І думаю, што вось ваш гэты візіт у Беларусь якраз будзе садзейнічаць вырашэнню падобных нюансаў».

За сем месяцаў 2020 года тавараабарот паміж Беларуссю і Браншчынай склаў каля 355 мільёнаў долараў, што трохі вышэй, чым у аналагічным леташнім перыядзе, звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы.

«Але, думаю, калі мы з вамі замахнёмся, то ў другім перыядзе вашага знаходжання на пасадзе дакладна зможам падысці да мільярда долараў тавараабароту Беларусі і Бранскай вобласці», — лічыць ён.

Аляксандр Лукашэнка бачыць добрыя перспектывы ў развіцці, перш за ўсё, прамкааперацыі і міжгаліновага ўзаемадзеяння. Асновай для далейшага росту ён назваў сумесную работу ў сельскай гаспадарцы, прамысловасці і будаўніцтве.

«Ведаю, што вы рэалізоўваеце вельмі вялікія праграмы. Іх шмат — пачынаючы ад сельскай гаспадаркі да дарожнага, жыллёвага будаўніцтва і гэтак далей. Калі мы будзем для вас карысныя, будзем вам удзячныя, калі вы нас запросіце і накрэсліце недзе на карце Бранска альбо ў іншым рэгіёне квартал і скажаце: вось гэта трэба спраектаваць і пабудаваць «пад ключ». Мы вам гэта зробім, як у іншых абласцях», — паабяцаў Прэзідэнт.

***Ён выказаў пажаданне, каб жыхары яшчэ аднаго расійскага рэгіёна ўбачылі менавіта комплекснае будаўніцтва ад беларусаў. Гэта датычыцца і прывядзення ў парадак дарог.*** Удзел у будаўнічых праектах Браншчыны выгадны для беларусаў з-за блізкай адлегласці, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Беларуская дзяржава зацікаўлена ў экспарце будаўнічых паслуг і таму, што мае, па словах Прэзідэнта, пэўны іх лішак на ўнутраным рынку. «Мы захавалі ўсе трэсты, якія былі некалі створаны ў савецкія часы. Мы іх перааснасцілі і нам вельмі важна загрузіць гэтыя магутнасці, — патлумачыў ён. — Тое, што мы будуем у Беларусі, быццам бы і не мала, але гэта недзе працэнтаў 70—80 ад магутнасці. Хацелася б атрымаць падрады, асабліва ў Расіі».

## «Трэба дапаўняць адно аднаго, а не канкурыраваць»

Адносна сумесных з Беларуссю прадпрыемстваў, якія маюцца на Браншчыне, Аляксандр Лукашэнка выказаў пажаданне выбудоўваць работу такім чынам, каб дапаўняць адно аднаго.

«Але ні якім чынам ***каб не біліся лбамі, не дубліравалі і тым больш не канкурыравалі адно з адным — нам гэта не трэба. Лепш мы разам аб'яднаемся і будзем канкурыраваць на іншых рынках»,*** — сказаў ён.

Прэзідэнт таксама выказаў гатоўнасць стварыць у Беларусі сумеснае прадпрыемства па вырабе будаўнічых матэрыялаў.

У сваю чаргу, Аляксандр Багамаз адзначыў, што Беларусь і Бранскую вобласць звязваюць добрыя адносіны ў самых розных сферах — ад эканомікі да культуры. Больш за трацiну знешнегандлёвага абароту гэтага расійскага рэгіёна прыпадае на Беларусь.

«Вы правільна сказалі: мы — суседзі. У нас у Беларусі шмат пражывае сяброў, знаёмых, сваякоў. І мы не па чутках ведаем, што адбываецца ў Беларусі. Мы заўсёды за вамі імкнуліся, заўсёды з вас бралі прыклад. Нас, вядома, здзіўляюць чысціня і дагледжанасць, дарогі. Ды і наогул усё, што сёння робіцца ў Беларусі», — сказаў губернатар Бранскай вобласці.

Па выніках размовы з Прэзідэнтам Аляксандр Багамаз паведаміў журналістам, што атрымаў падтрымку на стварэнне ў яго рэгіёне пляцоўкі па рэалізацыі беларускіх калійных угнаенняў. Ён адзначыў, што ў Бранскай і суседніх з ёй расійскіх абласцях развіваецца сельская гаспадарка, кожны год усё больш уносіцца мінеральных угнаенняў. «І праблему мы сёння адчуваем усе — гэта пастаўкі менавіта калійных угнаенняў», — сказаў губернатар.

Аляксандр Багамаз заўважыў, што ў Гомельскай вобласці, якая мяжуе з Бранскай, будуецца новае прадпрыемства па здабычы і вытворчасці калійных угнаенняў. Адпаведна, складваецца добрая лагістыка, каб з пляцоўкі на Браншчыне гандляваць угнаеннямі ва ўсёй Цэнтральнай федэральнай акрузе Расіі.

Акрамя таго, размова вялася пра стварэнне сумеснай базы па ўкараненні сучасных тэхналогій у сельскай гаспадарцы, абмене вопытам, узаемадзеянні ў навуковай сферы.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Новы эмір Кувейта афіцыйна ўступіў на трон



Наследны прынц Кувейта шэйх Наваф аль-Ахмед аль-Джабер ас-Сабах прыведзены да прысягі і стаў новым эмірам краіны, паведаміла Kuwait News Agency. Урачыстая цырымонія адбылася ў парламенце краіны. Падчас прывядзення да прысягі новы эмір пакляўся захаваць і абараніць Кувейт, а таксама працягнуць палітыку папярэдняга кіраўніка. 83-гадовы Наваф аль-Ахмед аль-Джабер ас-Сабах змяніў на гэтай пасадзе шэйха Сабаха аль-Ахмеда аль-Джабера ас-Сабаха, які памёр напярэдадні ва ўзросце 91 года ў ЗША, дзе ён знаходзіўся на рэабілітацыі пасля аперацыі. Сабах кіраваў краінай са студзеня 2006 года. У Кувейце абвешчана 40-дзённая нацыянальная жалоба. Ужо падчас шпіталізацыі Сабаха яго зводны брат наследны прынц Наваф быў надзелены шэрагам уладных паўнамоцтваў. Згодна з Канстытуцыяй Кувейта, спадчыннік прастола пасля смерці кіраўніка аўтаматычна становіцца эмірам, але прымае ўсю паўнату ўлады толькі пасля прынясення прысягі перад парламентам.

## Парламент Ізраіля ўхваліў абмежаванні на пратэсты



Кнэсет ухваліў закон, які прадугледжвае магчымасць увядзення абмежаванняў пры правядзенні вулічных дэманстрацый у рамках мер па барацьбе з каранавірусам. Аб гэтым паведаміла выданне The Times of Israel. Закон надзяляе ўрад краіны правам забараняць жыхарам краіны аддаляцца ад іх дома больш чым на адзін кіламетр, каб прыняць удзел у пратэстах, а таксама абмяжоўваць максімальную колькасць удзельнікаў сходаў на вуліцы да 20 чалавек. The Times of Israel адзначае, што гэтыя забароны, у прыватнасці, закрануць штотыднёвыя акцыі пратэсту, якія ладзяць жыхары краіны каля рэзідэнцыі прэм'ера Ізраіля Біньяміна Нетаньяху. Як вядома, у сярэдзіне верасня ў Ізраілі ўвялі рэжым агульнанацыянальнага каранціну з-за росту колькасці выпадкаў заражэння каранавірусам. Меркавалася, што ён будзе дзейнічаць падчас трох нацыянальных свят да 10 кастрычніка. Жыхары павінны заставацца ў радыусе аднаго кіламетра ад дома, а ўсе прыватныя прадпрыемствы, акрамя тых, без якіх нельга абысціся, закрытыя.

## Disney у ЗША звольніць 28 тысяч супрацоўнікаў паркаў забаў



Амерыканская Walt Disney Co., найбуйнейшая ў свеце кампанія ў сферы забаў і медыя, паведаміла аб планах скараціць 28 тысяч супрацоўнікаў яе тэматычных паркаў у ЗША на фоне крызісу, выкліканага пандэміяй. Гэта аб'ява была зроблена неўзабаве пасля таго, як улады Каліфорніі сігналізавалі, што парк забаў Disneyland Resort, верагодна, застанецца закрыты ў найбліжэйшай будучыні з-за апасенняў, звязаных з COVID-19. Работнікі, якіх звальнялі, з красавіка знаходзіліся ў неаплатным адпачынку з захаваннем медыцынскай страхоўкі. Прыкладна трацiна з іх працуюць на ўмовах няпоўнага рабочага часу, адзначаецца ў паведамленні Disney. У найбліжэйшы час кампанія плануе ўступіць у перагаворы з прафсаюзамі для абмеркавання «наступных крокаў». Disney адзначае, што становішча, выкліканае негатыўным уздзеяннем пандэміі, «пагоршылася ў Каліфорніі з-за нежадання ўлад штата здымаць абмежаванні, якія дазволілі б аднавіць працу Disneyland». Высокапастаўлены чыноўнік дэпартамента аховы здароўя штата заявіў, што сітуацыя ў акрузе Орындж, дзе знаходзіцца галоўны тэматычны парк Disney, не адпавядае патрабаванням, якія дазволілі б аслабіць абмежаванні ў дачыненні да бізнесу, паведаміла The Wall Street Journal.

Парламенцкі дзённік

# КАНСТЫТУЦЫЯ, БЮДЖЭТ, АДМІНІСТРАЦЫЙНЫ КОДЭКС

## Тры вяршыні восеньскага маршруту дэпутатаў

**Больш за 30 законапраектаў рыхтуецца да разгляду на восеньскай сесіі Палаты прадстаўнікоў, якая адкрыецца 2 кастрычніка. Першарадную ўвагу дэпутаты павінны ўдзяліць законам сацыяльна-эканамічнага блока, якія забяспечваюць устойлівы эканамічны рух, эфектыўнае развіццё бізнес-асяроддзя і сацыяльную абарону грамадзян, сказаў на пасяджэнні Савета Палаты прадстаўнікоў яе старшыня Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА.**

«Дэпутацкаму корпусу сёмага склікання ўпершыню трэба разгледзець пакет бюджэтных дакументаў краіны на будучы год, — паведаміў ён. — Дэпутаты ў складзе міжведамасных рабочых груп прымаюць ужо ўдзел у рабоце над рэспубліканскім бюджэтам на 2021 год і змяненнямі ў Падатковы кодэкс. Наша агульная задача — каб бюджэт быў эфектыўны, забяспечваў эфектыўнае расходаванне сродкаў, даў магчымасць у поўным аб'ёме выканаць сацыяльныя абавязацельствы дзяржавы».

Дэпутатам трэба будзе ўдзяляць увагу ў рабоце па абнаўленні Асноўнага закона краіны з прыцягненнем самага шырокага кола зацікаўленых, звярнуў увагу спікер.

«Канкрэтныя прапановы парламентарыяў па гэтым пытанні павінны быць прадстаўлены да канца кастрычніка ў Пастаянную камісію па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце, — адзначыў Уладзімір Андрэйчанка. — Неабходна таксама актыўна далучыцца да работы па фарміраванні праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на будучую пяцігодку, удасканаленні выбарчага заканадаўства, заканадаўства аб палітычных партыях, мясцовым кіраванні і самакіраванні, іншых ключавых прававых актаў, што датычацца палітычнага ўладкавання нашай дзяржавы. Так, дэпутаты ўжо накіравалі ў адпаведную міжведамасную рабочую групу шэраг прапаноў па пашырэнні паўнамоцтваў урада і мясцовых органаў улады».

Старшыня Палаты прадстаўнікоў таксама заявіў, што ў высокай ступені гатоўнасці знаходзяцца праекты КаАП і ПВКаАП.

«У міжсесійны перыяд Пастаянная камісія па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце правяла вялізную работу па гэтых кодэксах, — сказаў ён. — З удзелам прадстаўнікоў розных дзяржаўных органаў, бізнес-суполак і навуковых устаноў разгледжаны каля 400 заўваг і прапаноў. Усе шурпатасці, якія засталіся, трэба адпрацаваць у найбліжэйшы час, каб у лістападзе мы іх разгледзелі на пасяджэнні Палаты прадстаўнікоў».

Занятасць

# БЕСПРАЦОЎНЫХ — НА 16 % МЕНШ, ЧЫМ ЛЕТАСЬ

**Колькасць занятых у эканоміцы ў I паўгоддзі гэтага года склала 4 мільёны 323 тысячы чалавек, што на 0,3 % менш, чым у I паўгоддзі мінулага года. Пра гэта гаворыць аналітычная інфармацыя, падрыхтаваная ўпраўленнем эканамічнага аналізу Галоўнага ўпраўлення манетарнай палітыкі і эканамічнага аналізу Нацыянальнага банка краіны.**

Арганізацыямі (без уліку мікраарганізацый і малых арганізацый без ведамаснай падпарадкаванасці) у чэрвені гэтага года было прынята на работу 54,8 тысячы чалавек (1,9 % спісачнай колькасці работнікаў у сярэднім за чэрвень). Па розных прычынах звольнена 59,3 тысячы чалавек (2,1 % сярэднямесячнай колькасці). Колькасць беспрацоўных, зарэгістраваных у органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, на канец ліпеня гэтага года склала 10,1 тысячы чалавек, што на 16 % менш, чым на канец ліпеня мінулага года, і на 1,3 % больш, чым на канец чэрвеня 2020 года. Узровень зарэгістраванага беспрацоўя на канец ліпеня сёлета склаў 0,2 % ад колькасці рабочай сілы.

**Сяргей КУРКАЧ.**

З нагоды

# Катэгорыя шэсцьдзясят плюс

## Сёння адзначаецца Міжнародны Дзень пажылых людзей

**У структуры насельніцтва яны складаюць не менш за 15 %, і як і ва ўсіх развітых краінах, у нас штогод расце іх доля. Каля 2,5 мільёна беларусаў атрымліваюць пенсіі, пры гэтым каля 24 % пенсіянераў працягваюць працаваць. Якія меры сацыяльнай падтрымкі сёння даступныя і запатрабаваныя ў пажылых людзей, а таксама пра тое, што перашкаджае мужчынам «дагнаць» жанчын па працягласці жыцця, расказалі спецыялісты.**

### Больш за 600 тысяч пенсіянераў працягваюць працаваць

Яшчэ 10 гадоў таму пажылых людзей у краіне было 13 %. Але працягласць жыцця, у прыватнасці, на еўрапейскім кантыненце, расце, і наша краіна — не выключэнне. Таму з кожным годам доля людзей сталага веку павялічваецца.

— Павелічэнне колькасці пажылых людзей закранае ўсе бакі нашага жыцця. Гэта не толькі сістэма аховы здароўя і сацыяльнай абароны, але і ўстановы культуры, спорту і турызму, адаптацыя і даступнасць транспарту. З улікам гэтай праблематыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны распрацавала праект Нацыянальнай стратэгіі «Дастойнае даўгалецце — 2030», — расказвае **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Аляксандр РУМАК.**

Адным з немалаважных аспектаў жыцця пажылога чалавека з'яўляецца матэрыяльны дабрабыт. Каля 2,5 мільёна беларусаў атрымліваюць пенсіі па ўзросце, за выслугу гадоў, па інваліднасці. Сярэдні памер працоўнай пенсіі — 473 рублі 82 капейкі.

— Нягледзячы на розныя сацыяльна-эканамічныя змены, выплата пенсій вядзецца рэгулярна ва ўстаноўленыя дні, — падкрэслівае намеснік міністра.

Выплачваюцца і надбаўкі па ўзросце — пенсіянерам, якія дасягнулі 80 гадоў, інвалідам 1-й групы. Больш за 600 тысяч пенсіянераў у Беларусі працягваюць працаваць (а гэта 24 %). Каля 10 тысяч пажылых людзей штогод атрымліваюць або штомесячную, або аднаразовую дапамогу. Апошняя налічваецца пасля звароту ў органы сацыяльнай дапамогі, калі сталы чалавек мае патрэбу ў дарагіх леках, аперацыі. Памер такой дапамогі дасягае 10 бюджэтаў пражытачнага мінімуму (цяпер ён складае 256 рублёў 10 капеек).

— Сацыяльныя службы не чакаюць, пакуль чалавек звернецца сам, а абследуюць умовы жыцця адзінокіх людзей сталага веку. Штогод такім чынам наведваюць каля 200 тысяч чалавек. За першы квартал гэтага года абследаваны 140 тысяч адзінокіх пажылых людзей. Дапамога, якая ім патрабуецца і аказваецца найчасцей, — рамонт даху, электраправодкі і газавага абсталявання, — расказвае Аляксандр Румак.

Дарэчы, у структуры сацыяльных службаў у краіне дзейнічае 71 гаспадарчая брыгада, якая аказвае паслугі па доглядзе прысядзібных участкаў, і 148 мабільных брыгад, якія выязджаюць для аказання сацыяльных паслуг на аўтамабілі. Акрамя таго, маецца 1200 стацыянарных і нестацыянарных пунктаў па аказанні сацыяльных паслуг. Пераважна такія брыгады і пункты размешчаны ў сельскай мясцовасці, дзе доля пажылога насельніцтва вышэйшая, чым у гарадах.

Адным з самых запатрабаваных у пажылых людзей з'яўляюцца паслугі дома. Сёння іх атрымлівае 95,5 тысячы беларусаў. І штогод колькасць людзей, якія маюць патрэбу ў доглядзе дома, расце прыкладна на 1 %.

— Сацыяльны работнік наведвае пажылога чалавека два-пяць разоў на тыдзень. Ёсць і паслугі сядзелкі, калі стары чалавек не можа пра сябе паклапаціцца. Пры пяціразовым наведванні па дзве гадзіны ў дзень кошт паслугі складае каля 30 рублёў у месяц. Такую суму аплачваюць тыя пажылыя людзі, якія маюць дзяцей. Адзінокія і малазабяспечаныя вызваляюцца ад аплаты. Праўда, каля 80 % нашых падапечных маюць дзяцей — тыя аплачваюць паслугі сацработніка, — адзначыў Аляксандр Румак.

### Далечванне і аздараўленне ў санаторыі — без чаргі

Свае карэктывы ў работу сацыяльных службаў сёлета ўнесла распаўсюджванне каранавіруснай інфекцыі. У сувязі з гэтым была прыпынена дзейнасць аддзяленняў дзённага знаходжання. Тым часам актыўна вялася дастаўка прадуктаў, лекаў і іншых неабходных тавараў.

— Мы разгарнулі такую работу ў сакавіку, інтэнсіўна дзейнічалі ў красавіку-маі. Сацработнікі і валанцёры працавалі штодзённа без выхадных. І цяпер гэта дзейнасць не спынена, заяўкі па-ранейшаму прымаюцца, — паведаміў Аляксандр Румак.

Намеснік міністра звярнуў увагу, што з 20 мая адзінокія пенсіянеры, якія перанеслі каранавірусную інфекцыю, з медустаноў пры жаданні маглі адразу паехаць на двухтыднёвае далечванне ў санаторый. Чатыры здраўніцы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны прымалі такіх людзей (санаторыі «Ясельда», «Белая Вежа», «Беразіна» і «Вяжуці»). Такое далечванне прайшлі 475 чалавек. А з 1 ліпеня на аздараўленне і санаторна-курортнае лячэнне ў гэтыя санаторыі пенсіянеры, якія перанеслі COVID-19, маглі паехаць без чаргі.

### Што пагаршае якасць жыцця ў старасці?

Адным з важных аспектаў якасці жыцця пажылога чалавека з'яўляецца стан яго здароўя.

— Сённяшнія тэхналогіі, у тым ліку імплантацыя суставаў, аортакаранарнае шунціраванне, трансплантацыі дазваляюць павялічыць працягласць жыцця. У жанчын яна дасягае 78 гадоў. У мужчын, на жаль, больш чым на дзесяць гадоў менш — 64, — кажа **галоўны пазаштатны спецыяліст па геранталогіі Міністэрства аховы здароўя Людміла ЖЫЛЕВІЧ.** — І карані гэтай праблемы — у дзяцінстве. Калі чалавек курыў 50 гадоў, а ў старасці кінуў, то чакаць, што ўсе негатыўныя наступствы адразу знікнуць, не трэба. Але пры гэтым калі ў 60 гадоў кінуць курыць, то рызыка раптоўнай каранарнай смерці зніжаецца на 25 %. На жаль, такія фактары рызыкі, як курэнне, ужыванне алкаголю, маларухомы спосаб жыцця пакуль не даюць мужчынам «дагнаць» жанчын па працягласці жыцця.

Герантолаг падкрэсліла, што ёсць пяцьшэсць хранічных захворванняў, якія істотна пагаршаюць якасць жыцця ў сталым узросце. Сярод іх — хваробы сістэмы кровазвароту, у першую чаргу, хранічная сардэчная недастатковасць, а таксама цукровы дыябет. Вялікую праблему ствараюць і хваробы апорна-рухальнага апарату. Яшчэ адна бяда, з якой сутыкаюцца пажылыя людзі, — дэменцыя. Колькасць яе выпадкаў расце, што таксама з'яўляецца наступствам павелічэння працягласці жыцця.

— У 10 % пажылых людзей назіраецца ранняя праявы дэменцыі. Яны захавалі самакрытыку і могуць звярнуцца па дапамогу. Існуюць методыкі для прафілактыкі і спынення развіцця дэменцыі. Наступная фаза — калі людзі не захавалі крытычнага стаўлення да сябе і патрабуюць догляду. Іх блізкія сутыкаюцца з праблемай: яны вымушаны пакінуць работу, каб дапамагаць такому чалавеку, — адзначае Людміла Жылевіч.

Аляксандр Румак паведаміў, што з гэтага года ўнесены змены ў пералік сацыяльных паслуг пажылым людзям. З'явіліся магчымасці, у першую чаргу для людзей з дэменцыяй, дастаўляць іх на дзень у сацыяльную ўстанову, напрыклад, аддзяленне дзённага знаходжання, а на ноч забіраць у сям'ю, каб пажылы чалавек заставаўся ў дамашніх умовах, і ў той жа час атрымліваў кваліфікаваныя догляд і дапамогу.




**Алена КРАВЕЦ.**

Сугучча

# ЯНКА КУПАЛА: НОВЫЯ СЕРБСКІЯ СЦЕЖКІ

**Народны паэт Беларусі Янка Купала вядомы, лічы, усяму свету. Пераклады яго твораў зроблены болей як на сто моў. І вось новае выданне класіка беларускай нацыянальнай літаратуры (у друкаванай і электроннай версіях) выходзіць у Сербіі — у серыі «Бібліятэка беларускай кніжнасці» выдавецтва «АЛМА».**




Зборнік пачынаецца перакладамі вершаў, якія паэт стварыў у 1905—1907 гады. А завяршаецца вершам «Беларускім партызанам», які напісаны, як вядома, у 1941 годзе. Ёсць тут і легендарны твор — «А хто там ідзе?». Дарэчы, усяго існуе чатыры пераклады гэтага верша на сербскую/сербскахарвацкую мову. Яны зроблены Дэсанкай Максімавіч, Мамчылай Джэркавіч, Міадрагам Сібінавічам і Даянай Лазаравіч. І ўсе вершы для новай сербскай кнігі Янкі Купалы «Спадчына» пераклала Даяна Лазаравіч.

Даяна Лазаравіч — малады і настойлівы прапагандыст беларускай літаратуры ў сучаснай Сербіі. Яна адна робіць столькі, колькі не пад сілу іншым інстытутам, асветніцкім цэнтрам альбо кніжным выдавецтвам. Руплівасць сербскай перакладчыцы і бібліёграфа (Даяна падрыхтавала поўны бібліяграфічны агляд таго, што надрукавана з перакладаў беларускай літаратуры ў Сербіі болей як за стагоддзе!) пацвярджаюць наступныя факты: пачынаючы з 2017 года, перакладчыца выдала ў Бялградзе кнігі беларускіх паэтаў і празаікаў Максіма Багдановіча, Віктара Кажуры, Сяргея Панізніка, Марыі Кобец, Алеся Бадака, Святланы Быкавай, Валерыя Казакова... А што ўжо казаць пра публікацыі твораў беларускіх паэтаў у сербскай перыёдыцы ў перакладах Даяны Лазаравіч! Лік падаецца бясконцым. Якуб Колас, Максім Танк, Алесь Бачыла, Уладзімір Караткевіч... Сербская перакладчыца працуе натхнёна і з вялікай увагай да гісторыі беларускай літаратуры і ўсяго, што сёння характарызуе літаратурны працэс у нашай краіне. Як ацэнка яе здзяйсненняў — прыняцце Даяны Лазаравіч у склад сяброў Саюза пісьменнікаў Беларусі. Перакладчыца часта бывае ў Беларусі. Яна прыязджала і на Міжнародны сімпозіум літаратараў «Пісьменнік і час», які штогод ладзяць Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь і Саюз пісьменнікаў Беларусі пры ўдзеле Выдавецкага дома «Звязда». Сербскую перакладчыцу добра ведаюць у Літаратурным музеі Янкі Купалы, у Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры, Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, іншых музеях, бібліятэках, асветніцкіх установах Мінска...

Сербская «спадчына» Янкі Купалы завяршаецца грунтоўным артыкулам-пасляслоўем доктара філалагічных навук, прафесара Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Івана Чароты «Янка Купала ў сваім родзе і на пасадзе між народамі». Літаратуразнаўца і — гэта нельга не падкрэсліць — слынны сербіст падрабязна расказвае пра прачытанне творчасці і лёсу народнага песняра Беларусі папярэднікамі Даяны Лазаравіч у краінах былой Югаславіі, непасрэдна ў Сербіі. Пачатак, дарэчы, быў пакладзены рэцэнзіяй нататкай у славенскім часопісе «Dom in svet» у 1908 годзе. Аўтар тэксту «Песні Янука Купалы» — Леапольд Ленард (1876—1962), гісторык, публіцыст, культуролаг, лінгвіст, літаратуразнавец, крытык, святар. Для напаміну: першыя рэцэнзіі на Радзіме, у Беларусі, на першы зборнік Я. Купалы з'явіліся 9 ліпеня і 15 жніўня 1908 года — у газетах «Минское эхо» і «Наша ніва».

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

Акцыя

# «ЧЫСТЫ ЛЕС» ЗАПРАШАЕ 17 КАСТРЫЧНІКА

**Кампанія па навядзенні парадку ў лясным фондзе будзе прымеркавана да Года малой радзімы. На працягу дня валанцёры змогуць дапамагчы лясгасам у ліквідацыі несанкцыянаваных звалак будаўнічых і бытавых адходаў, старонніх прадметаў у лясах, якія прымыкаюць да аўтамабільных і чыгуначных дарог, вакол населеных пунктаў, садаводчых таварыстваў і дачных кааператываў. Асаблівая ўвага будзе нададзена месцам масавага адпачынку насельніцтва, а таксама добраўпарадкаванню памятных аб'ектаў.**

Стаць удзельнікам акцыі зможа кожны ахвотны. Для гэтага дастаткова звярнуцца ў бліжэйшы лясгас або лясніцтва і заявіць пра сваё жаданне дапамагчы ў навядзенні парадку ў лесе. Арганізацыі Міністэрства лясной гаспадаркі забяспечаць усіх удзельнікаў мерапрыемства неабходным інвентаром.

Найбольш актыўным удзельнікам акцыі традыцыйна будуць уручаны сувеніры. Для таго каб атрымаць памятны падарунак, неабходна размясціць фота і (або) відэа з месца ўдзелу ў акцыі ў сацыяльных сетках (Facebook, Instagram, Twitter) з хэштэгамі #ЧыстыЛес2020 і #ЧістыйЛес2020, паведамляе прэс-служба Міністэрства лясной гаспадаркі.

Акрамя таго, кожнае дзіця, якое прыме ўдзел у экалагічнай кампаніі, атрымае ў падарунак ад лесагаспадарчых устаноў цікавы сувенір.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Супрацоўніцтва

# ЧАТЫРЫ МІЛЬЯРДЫ — НЕ МЯЖА

## Кіраўнікі Гомельскай і Бранскай абласцей вызначылі перспектыўныя кірункі далейшага супрацоўніцтва

**У Гомелі прайшла сустрэча старшыні Гомельскага аблвыканкама Генадзя САЛАЎЯ з губернатарам Бранскай вобласці Аляксандрам БАГАМАЗАМ.**

Прыкладам паспяховай вытворчай кааперацыі паміж беларускім і расійскім рэгіёнамі з'яўляецца прадпрыемства «Бранксельмаш», створанае ў 2005 годзе сумесна з ААТ «Гомсельмаш». З Гомеля ў Бранск адгружаюць машынакамплекты, а затым сумеснае прадпрыемства ў расійскім рэгіёне рэалізуе прафесійным спажыўцам гатовыя машыны.

«Сёлета плануецца рэалізаваць на адрас «Брансксельмаша» больш за 800 адзінак на суму больш за чатыры мільярды расійскіх рублёў», — адзначыў старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь Салавей.

Акрамя таго, прадпрыемства ААТ «Гомельагракамплект» завяршае пастаўку першай чаргі — камплекты стойлавага абсталявання на шэсць тысяч галоў — на малочнатаварны комплекс ААТ «Брасава» Бранскай вобласці. Таксама на прадпрыемстве прапрацоўваюць новы від даільнага абсталявання каруселънага тыпу.

Па словах кіраўніка Гомельскага рэгіёна, летась тавараабарот паміж рэгіёнамі вырас больш чым на 10 % у параўнанні з 2018 годам. «Цяпер удзельная вага тавараабароту Гомельскай вобласці з Бранскай перавышае 5 % у гандлі з Расійскай Федэрацыяй, у экспарце — больш чым 9 %, у імпарце — каля 3 %», — адзначыў ён.

Гомельскія прадпрыемствы пастаўляюць на Браншчыну сельгастэхніку, малочныя прадукты, кардон і паперу, чорныя металы і вырабы з іх, а таксама іншыя тавары.

Міжрэгіянальнае супрацоўніцтва развіваецца і ў іншых кірунках.

«На жаль, эпідэміялагічная абстаноўка ўнесла карэктывы ў сустрэчы і прамыя стасункі. Спадзяюся, што паляпшэнне сітуацыі дазволіць нам рэалізаваць новыя праекты і сумесныя мерапрыемствы», — падкрэсліў Генадзь Салавей і выказаў гатоўнасць да ўсебаковага ўзаемадзеяння, пошуку новых формаў і кірункаў супрацоўніцтва. «Для нас вельмі важныя партнёрскія адносіны і супрацоўніцтва з Бранскай вобласцю. Нас звязвае агульная гісторыя, мы гэта шануем і паважаем. Мы і далей будзем развіваць супрацоўніцтва ў розных кірунках», — адзначыў старшыня Гомельскага аблвыканкама.

Цеснае ўзаемадзеянне ў гандлёва-эканамічнай, навукова-тэхнічнай, гуманітарнай і культурнай сферах Гомель і Бранск актыўна развіваюць з 1999 года, калі была падпісана дамова аб супрацоўніцтве.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

Праект

# СТАЛАСЦЬ — НЕ ПЕРАШКОДА

## Дэкада «Залатыя ўзрост» стартавала ў Гродне дзясяты раз

**Ва ўсіх раёнах вобласці арганізаваны віншаванні сталым людзям. Праграма складзена такім чынам, каб яны маглі цікава правесці час. Будуць наладжаны экскурсіі, спектаклі і майстар-класы. Калектывы прадпрыемстваў і арганізацый ушануюць сваіх ветэранаў працы.**



Урачыстае адкрыццё дэкады «Залаты ўзрост» адбылося 28 верасня ў гарадскім Доме культуры з удзелам абласных улад. **Першы намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Іван ЖУК** адзначыў высокую актыўнасць старэйшага пакалення. У гэтым відавочная і падтрымка як прамысловых прадпрыемстваў, так і аграпрамысловага комплексу. Тут і дадатковыя выплаты, паслугі па дастаўцы паліва ў сельскай мясцовасці, дапамога ў нарыхтоўцы агародніны. Асаблівая ўвага надаецца адзінокім і адзінока пражываючым сталым людзям.

**Старшыня абласнога Савета ветэранаў Іван ТУСТАЎ** паведаміў, што падрыхтавана цікавая і разнастайная праграма ва ўсіх раёнах Гродзеншчыны. Падчас дэкады адбудуцца бясплатныя экскурсіі, прагляды кінафільмаў і спектакляў, творчыя сустрэчы, майстар-класы па бісерапляценні, саломапляценні, валенні воўны. Пройдуць святочныя канцэрты, прыёмы ветэранаў на прадпрыемствах і нават спартыўныя спаборніцтвы.

У Гродзенскай вобласці пражывае больш за 300 тысяч пенсіянераў. Па словах **старшыні культурна-масавай камісіі Савета ветэранаў Кастрычніцкага раёна Гродна Ірыны МУРАШОВАЙ,** удзел у мерапрыемствах дапамагае людзям не сумаваць, ствараць добры настрой, адчуваць сябе бадзёрымі і запатрабаванымі.

Закрыццё дэкады пройдзе ўрачыста 7 кастрычніка.

Дэкада прымеркавана да Міжнароднага Дня пажылых людзей, які адзначаецца 1 кастрычніка.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# БОНУСЫ ІНІЦЫЯТЫЎНЫМ

### Шпаргалка для «чайнікаў»

У Лёзненскім раёне тым, хто хоча працаваць на сябе — грэх скардзіцца на мясцовую ўладу. Кожны, хто пажадае, можа, нават не выходзячы за дзверы жылля, пачаць навучацца азам бізнесу.

Так, у раённай газеце «Сцяг перамогі» існуе праект «Свая справа: парады для «чайнікаў» і не толькі». У рэдакцыі канстатуюць, што моладзь, людзі сярэдняга, ды і некаторыя асобы перадпенсійнага ўзросту і рады б стаць прадпрымальнікамі, але іх спыняе адсутнасць разумення, чым хацелі б заняцца. Журналісты кажуць, што элементарнае няведанне, з чаго пачаць, як афармляць дакументацыю, падатковыя нюансы не спрыяюць павелічэнню колькасці дзелавых людзей. Таму газета вырашыла выступіць пляцоўкай для своеасаблівай школы бізнесу і запрашаць да сябе спецыялістаў у розных сферах...

Тут ужо размясцілі інфармацыю пра тое, як атрымаць грошы з бюджэту для адкрыцця сваёй справы, распачаць бізнес без рэгістрацыі ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка, знайсці сваю нішу на рынку паслуг і гэтак далей. У рамках праекта праводзяцца тэматычныя семінары, дзе падказваюць, што рабіць, калі, як той казаў, «прыйшла праверка», пра ролю малога бізнесу ў эканоміцы раёна.



Таццяна ГІЛАВЕЙНЯ, цырульнік з Лёзна.

Безумоўна, лепшая рэклама бізнесу — споведзь тых, хто ім пачаў займацца ці наогул мае добры вопыт. Вельмі натхняюць словы Сяргея Козыра, старэйшыны вёскі Ордзеж, які ў сярэдзіне 1990-х вырашыў заняцца фермерствам. Ён надзвычай цікава расказаў пра першыя няўдачы, ва неўраджайныя гады і, наадварот, пра тое, як развіваў гаспадарку, аб тым, што як акупляецца...

У аддзеле эканомікі райвыканкама паведамілі — на Лёзненшчыне сем сялянска-фермерскіх гаспадарак.

### Рады кожнаму

Малы бізнес Лёзненскага раёна, акрамя гэтага, прадстаўлены каля 140 індывідуальнымі прадпрымальнікамі, прыблізна 40 арганізацыямі прыватнай формы ўласнасці. Прадпрымальніцтва вядзецца ў пяці галінах эканомікі: у гандлі, вытворчасці, паслугах, транспарце, будаўніцтве.

У райвыканкаме нагадалі, што ва ўмовах рыначнай эканомікі развіццё малога прадпрымальніцтва — асноўва стварэння канкурэнтнага асяроддзя. Зразумела, што яно служыць і пашырэнню экспартнага патэнцыялу, інвестыцыйнай дзейнасці, павышэнню мабільнасці і эфектыўнасці вытворчасці. І, канешне, усё гэта забяспечвае стабільнасць у развіцці любога рэгіёна.

**Намеснік старшыні райвыканкама па сацыяльных пытаннях Ірына ДЗЕРВАЕД** паведаміла, што для ахвотных працаваць на сябе ў райвыканкаме дзверы адчынены на ўсіх узроўнях кіраўніцтва, дастаткова толькі праявіць інтарэс. Тады прakансультуюць па розных пытаннях, падкажуць, чым лепш заняцца, якая ніша можа стаць той самай — залатой жылай». Абавязкова дадуць канкрэтныя парады, дзе ўзяць стартавы капітал, набыць тэхніку і інструменты, дапамогуць знайсці памяшканні.

Самазанятасць у жыхароў раёна становіцца ўсё больш папулярнай. Ва ўпраўленні па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Лёзненскага раённага выканаўчага камітэта паведамілі, што летась зарэгістравалі 65 рамеснікаў, трох уладальнікаў аб'ектаў сельскага турызму і 64 плацельшчыкаў адзінага падатку.

### Мастацтва рабіць прыгажосць

Таццяна Гілавейня якраз і плаціць адзіны падатак, бо робіць прычоскі. Працуе на першым паверсе будынка, дзе раней знаходзілася раённае спажывецкае таварыства.

Між іншым, у гарадскім пасёлку з насельніцтвам каля 6,7 тысячы чалавек разам з дзяржаўнай — ажно сем цырульняў. І як яны змагаюцца за кліентаў? Мая суразмоўніца кажа, што, напрыклад, да яе любяць прыходзіць жанчыны з дзецьмі. Зразумела, малым цяжка доўга сядзець на месцы. Але Таццяна, як сапраўдная чараўніца, знаходзіць падыход да самай капрызнай дзяўчынкі ці хлапчука.

Ды і да вельмі «зорных» дарослых знойдзе падыход. Яна — майстар-універсал. Дарэчы, на мой жарт наконт таго, што мо і барбер, сказала, што, канешне, цырульнікі не вельмі любяць «вазіцца з барадой», бо часу трэба шмат, ды і ўсё-такі, адчуваецца дэфіцыт адпаведных інструментаў. Але мужчыны ведаюць, да каго прыйсці — і гэта яна ўмее.

Таццяна расказвае пра сваю справу, як паэт, узнёслымі словамі. Ну, напрыклад: «Гэта прафесія натхняе і развівае». Цырульнік з гумарам кажа, што ў яе ёсць нават муза — муж! Дарэчы, ён таксама творчы чалавек — мастак па адукацыі. Яго вырабы з металу — лаўку і кветку — можна ўбачыць у цырульні.

Дарэчы, навучалася Таццяна мастацтву цырульніка ў Віцебскім індустрыяльна-педагагічным каледжы. Ездзіла туды штодня на вучобу, знаходзячыся пры гэтым у дэкрэтным адпачынку, з Лёзна — гэта прыкладна сорак кіламетраў. А першыя ўрокі яна атрымала ў пачатку 1990-х, калі вучылася ў Віцебску на швачку-вышывальшчыцу. Тады былая майстар прычосак запрасіла яе ў гурток.

Да таго як пачаць зарабляць самастойна, папрацавала ў адным з лёзненскіх салонаў прыгажосці. І ў расійскую Рудню, да якой прыкладна пятнаццаць кіламетраў, ездзіла. Там вельмі цанілі яе ветлівасць, сур'ёзнасць у плане асваення прафесіі і жаданне стаць майстрам з вялікай літары. У сваю чаргу жанчына вельмі ўдзячная тым, хто да яе прыходзіў, верыў у тое, што яна зможа іх зрабіць больш прывабнымі.

Але ж Таццяна вырашыла, што быць сама сабе гаспадыняй на рабоце — лепш.

Што датычыцца падаткаў, кожны месяц плаціць крыху больш за дваццаць рублёў. Хочаш працаваць толькі па выкліках, дома ў кліентаў — калі ласка. Акрамя нядзелі, Таццяна ўвесь час у салоне. Канешне, на заробку адбіваецца сезоннасць: у цёплы час года жанчыны часцей прыходзяць, каб навесці прыгажосць. Блізкасць абласнога цэнтра ўплывае таксама, бо некаторыя прынцыпова хочуць зрабіць прычоску ў горадзе, маўляў, так больш прэстыжна. Але, калі параўноўваюць суадносіны цаны і якасці, нярэдка адзін раз, звярнуўшыся да Тані, больш не марнуюць грошы і час, каб даехаць у Віцебск.

Безумоўна, чалавечы фактар у бізнесе — вельмі важна. Калі ты да кожнага адносішся, як да чаканага госця, будуць стаяць і ў чарзе па паслугу.

***P.S.*** *У глыбінцы бізнесу прапануюцца прэферэнцыі. І гэтым карыстаюцца ўсё больш тых, хто аказвае паслугі. Тут багаты выбар аб'ектаў нерухомасці, працавітыя людзі, якія з лёгкасцю змогуць змяніць сферу дзейнасці, блізкасць да Расіі — «бонусы», якія робяць інвестыцыі ў перыферыю прывабнымі.*

**Аляксандр ПУКШАНСКІ, фота аўтара.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

1 КАСТРЫЧНІКА 2020 г.
ЧАЦВЕР
№ 18 (15895)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года


Імёны

**Павел ЛЮБЧАНКА:**

# «Лепш канцэрт, чым удзел у конкурсе»



**Песні гэтага выканаўцы гучаць на беларускіх і расійскіх тэлеканалах, іх можна пачуць не толькі на айчынных радыёхвалях, але і на многіх FM-радыёстанцыях ЗША, Германіі, Ізраіля, Вялікабрытаніі, Расіі. Кампазіцыі «Зорныя ночы», «Без правілаў», «Каханне-пастка», «Мая каралева Беларусь» ведаюць і любяць па ўсёй краіне, асабліва на роднай для яго Магілёўшчыне. У музычных творах спевака шмат рамантыкі і тонкай лірыкі, якія ён цудоўна перадае дзякуючы свайму выканаўчаму майстэрству. Вы яшчэ не знаёмыя з гэтым таленавітым маладым чалавекам? Тады мы з радасцю прадстаўляем яго вам у нашым эксклюзіўным інтэрв'ю. Знаёмцеся — саліст-вакаліст Магілёўскай абласной філармоніі, шоўмен, спявак, а таксама ідэйны натхняльнік і капітан футбольнай арт-каманды «Дняпро STARS» Паша Любчанка.**

***— Раскажыце пра сваё станаўленне як артыста, з чаго ўсё пачалося?***

— Зерне творчасці і музыкі заклаў у мяне мой старэйшы брат Уладзімір. Мне было гадоў пяць, калі ў сям'і з'явіўся першы бабінны магнітафон. Слухалі музыку Modern Talking, гурты «Фрыстайл», «Ласкавы май». Перамотвалі кампазіцыі, да дзірак сціраючы магнітную стужку. Брат іграў на гітары, а я падпяваў, аднойчы нават зламаў інструмент, за што атрымаў вельмі сур'ёзна *(смяецца)*. Аднак брат не звязаў сваё жыццё з творчасцю, а вось у мяне зерне прарасло. Памятаю, у дзясятым класе аб'явілі конкурс, дзе сярод іншых нумароў патрэбны былі і вакальны. Я быў вельмі сціплым вучнем: ніхто нават і падумаць не мог, што буду спяваць, тым больш на сцэне. Унутры ж адчуваў вялізнае жаданне выступаць, якое стрымліваў праз тую самую сціпласць. І вось у выніку прапанаванага настаўніцай лёсавання мне дастаўся запаветны вакальны нумар. Гэта быў мой першы вопыт, я выканаў хіт «Хлопчык хоча ў Тамбоў» Мурата Насырава і атрымаў столькі станоўчых водгукаў, што ў далейшым без майго ўдзелу не абыходзілася ніводнае мерапрыемства.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Ёсць ідэя!

## БЫЦЬ «ПЕРШЫМІ» — БЫЦЬ НАПЕРАДЗЕ ЎСІХ

### Чым здзівілі фіналісты праекта?

**«Рабі нечаканае, рабі, як не бывае, рабі, як не робіць ніхто, — і тады пераможаш». Шмат кніг напісана пра крэатыўнасць, пра пошук ідэй, але менавіта гэтая фраза з аповесці Уладзіміра Караткевіча «Ладдзя роспачы» — самая трапная. Рабі нечаканае! Менавіта хлопцы і дзяўчаты, якія робяць нечаканае і прапануюць нестандартныя ідэі, выйшлі ў знакаміты чырвоны круг інтэлектуальнай маладзёжнай канферэнцыі TEDxYouth@Minsk, якая прайшла ў анлайн-фармаце на відэасэрвісе VOKA. Дзякуючы прамой трансляцыі тысячы гледачоў па ўсім свеце маглі не толькі ўбачыць выступленні спікераў, але і задаць ім свае пытанні, бо TED — не толькі слуханне, але і дыялог.**

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*



«Першыя» — гэта конкурс яскравых ідэй пакалення Z.

Лакацыі актыўнасці

## АНЛАЙН ШТОДНЯ

### Як развіваюцца маладыя insta-блогеры

**На сённяшні дзень Instagram з'яўляецца самай папулярнай сацыяльнай сеткай. У ёй зарэгістравана больш за адзін мільярд чалавек, і кожны спрабуе «раскруціць» сваю старонку і займець максімальную колькасць падпісчыкаў. Некаторыя з іх настолькі захапляюцца інтэрактыўным жыццём, што становяцца ўжо не проста карыстальнікамі, а сапраўднымі insta-блогерамі. Мы пагаварылі з адным з такіх прадстаўнікоў, Ірынай РАГАВОЙ, і высветлілі, якія тэмы цяпер актуальныя ў стасунках з падпісчыкамі, як рэагаваць на хейтараў і ці можна лічыць insta-блогерства прафесіяй.**



Наогул, каб разумець, пра што будзе ісці гутарка з нашай гераіняй, трэба разабрацца, чым жа адрозніваецца insta-блогер ад звычайнага карыстальніка гэтай сацыяльнай сеткі.

— Многія не ўспрымаюць блогерства як прафесію, а лічаць, што гэта проста хобі ці несур'ёзнае захапленне. Аднак яны вельмі памыляюцца. Каб мець поспех у гэтай справе і стаць сапраўдным прафесіяналам, трэба прыкласці шмат намаганняў, часу і да таго ж часта патрэбны немалыя фінансы. Адрозненне insta-блогера ад блогераў іншых інтэрнэт-пармалаў ці сацыяльных сетак у тым, што яны абавязаны ўзаемадзейнічаць са сваімі падпісчыкамі штодня, праводзіць прамыя эфіры, пакідаць гісторыі і выкладваць новыя пасты. Але галоўнае, на мой погляд, адрозненне insta-блогера ад простага карыстальніка ў тым, што першы шукае не той кантэнт, які будзе цікавы толькі яму, а тое. што актуальна сярод падпісчыкаў.

*(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)*

# БЫЦЬ «ПЕРШЫМІ» — БЫЦЬ НАПЕРАДЗЕ ЎСІХ

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Канферэнцыя TEDxYouth@Minsk з'яўляецца часткай сусветнага руху TEDx у нашай краіне. Сёлета яна атрымала падтрымку сацыяльна-адукацыйнага праекта «Першыя», які рэалізуецца кампаніяй А1. «Першыя» — гэта конкурс яскравых ідэй пакалення Z, які быў абвешчаны ў кастрычніку 2019 года для вучняў 9-х, 10-х і 11-х класаў. Цягам навучальнага года школьнікі распрацоўвалі свае праекты ў чатырох тэматычных кірунках — «Экалогія», «Тэхналогіі», «Інклюзія» і «Культура», а таксама бралі ўдзел у крэатонах у Мінску, Віцебску, Магілёве, Гомелі і Гродне. Спецыяльна для канкурсантаў быў запушчаны першы беларускамоўны падкаст для моладзі, у якім прафесіяналы з розных сфер дзяліліся парадамі па запуску і прэзентацыі праектаў.

Журы конкурсу «Першыя» прагледзела больш за сотню відэазаявак і выбрала дзесяць самых цікавых ідэй. Іх аўтары рыхтавалі свае дзесяціхвілінныя прамовы разам з ментарамі — прадстаўнікамі беларускай супольнасці TED. Па традыцыі прамовы ўсіх спікераў гучалі па-беларуску, бо адна з мэт «Першых» — пашырэнне выкарыстання беларускай мовы.

## INSTAGRAM I TikTok ПА-БЕЛАРУСКУ

Як прызналася адна з фіналістак, **вучаніца гомельскай гімназіі № 10 Ангеліна СЕБІК**, у пачатковай школе беларуская мова не была яе любімым прадметам.



Ангеліна Себік: «Беларуская мова — не проста хобі, а асяроддзе для камунікацыі».

— Як і многія мае аднагодкі, я лічыла гэтыя ўрокі марнаваннем часу, бо ніхто не мог нам растлумачыць, а навошта мы ўвогуле вывучаем беларускую мову, — успамінае дзяўчына. — Да таго ж па-за межамі класа і ўрока ніхто на ёй не размаўляў. Але летась прайшло першае інстаграм-шоу па-беларуску «Мова Чэлендж», якое прымусіла мяне перагледзець сваё стаўленне да роднай мовы (у яго герояў ёсць месяц, каб пачаць размаўляць па-беларуску. — **Аўт.**). Я даведалася, што ёсць беларускамоўны рэп, рок і хіп-хоп.

Ці заўважалі вы, што беларускія карыстальнікі інтэрнэту, як правіла, выбіраюць рускую мову ў настройках. А ці ведаеце вы, што YouTube дзеліць карыстальнікаў сэрвісу не па краінах, а па мове. І калі вы часта глядзіце відэа на рускай мове, і яна ўстаноўлена ў вашых настройках, то алгарытмы аўтаматычна залічаць вас да рускамоўных. Таму верагоднасць таго, што сярод рэкамендаваных вам відэа трапіцца беларускамоўнае, вельмі і вельмі маленькая. Калі я даведалася пра гэта, была збянтэжаная. Аднак, рэфлексуючы, прыйшла да думкі, што нестандартная развязка гэтага пытання адной можа стаць «цікавінкай» беларускай медыякультуры. Я зразумела, што мне трэба зацікавіць менавіта рухавік беларускай інтэрнэт-культуры — моладзь — і ўспомніла, як сама калісьці прыйшла да беларускай мовы праз «Мову Чэлендж». Што мяне тады зацікавіла, дык гэта шчырыя прыклады самых звычайных людзей, іх актыўны ўдзел і сучасная жывая камунікацыя.

Значыць, трэба вынаходзіць фармат, у якім беларускамоўныя блогеры будуць дзяліцца нейкімі актуальнымі ведамі і навыкамі XXI стагодддзя, а іх гледачы (слухачы) — укараняць іх на практыцы, але, што самае галоўнае, — пагладзяць на беларускую мову зусім з іншага боку, пазнаюць беларускі слэнг, мемы, адкрыюць для сябе зусім іншы свет...

Ангеліна ўпэўнена, што цяпер існуе попыт на сучасную жывую беларушчыну. «Трэба адыходзіць ад важных, але састарэлых тэм — родных ніў, мінулага, зуброў і буслоў — і стварэць сучасную камунікацыю на актуальныя тэмы, — разважае дзяўчына. — Я лічу, што добрым выйсцем будуць воркшопы. Чаму? Бо гэта фармат актыўнага ўдзелу: з аднаго боку, ментары дзеляцца сваімі ведамі, а з іншага — акурат тут жа практыкуюць здабытыя веды іх гледачы. Ментарамі будуць беларускамоўныя блогеры, якія падзеляцца новым поглядам на родную мову. Мы зможам рабіць беларускамоўныя пoсты і відэа для TikTok і Instagram. Трэба паказаць, што існуе не толькі рускамоўны кантэнт. А беларуская мова — не проста хобі ці інструмент для работы, а наша асяроддзе для камунікацыі. Пачаць можна ўжо сёння. Тады зменяцца і алгарытмы ў сацсетках, з'явіцца беларускі офіс Google... Беларуская мова жыве і будзе жыць, але ў якім увасабленні, залежыць толькі ад нас.

## ПАЭТЫЧНЫЯ МУРАЛЫ

А вось **адзінаццацікласнік брэсцкай гімназіі № 1 Дзяніс РАБЧУК** для папулярызацыі беларускай мовы прапануе выкарыстоўваць не сучасныя тэхналогіі, а... «наскальны жывапіс».



Дзяніс Рабчук: «Мы проста не ведалі, якія ж з тысяч вершаў павінны апынуцца на сценах...»

— Стрыт-арт дапамагае мастакам праявіць сябе ў незвычайных умовах і знайсці свайго гледача не толькі ў галерэях ці арт-прасторах, але і ў месцах з большай колькасцю наведвальнікаў — на вуліцы. На жаль, агромністы патэнцыял беларускага стрыт-арту збольшага не рэалізаваны, але ў нас ёсць шмат сцен, якія можна ўпрыгожыць мураламі з сацыяльным значэннем, філасофскімі выявамі і вершамі. Вершы, як мова гутаркі з натоўпам. Вуліцы — як месца гэтай аўдыенцыі. Стрыт-арт — як пасярэднік у размове. Так і нарадзіўся праект #vershybrest, які перанёс вершаваныя радкі са старонак кніг на сцены вуліц, — расказвае юнак. — Здараецца, што яшчэ на моманце з'яўлення ідэі шмат хто спыняецца: няма каманды, досведу, грошай... Але ж ці нельга гэта ўсё знайсці? Мой адказ — можна! Вакол нас ёсць шмат людзей, якія жадаюць змяніць сваё асяроддзе, трэба проста ім прапанаваць. Так я і зрабіў. Так і сфарміравалася наша каманда — на жаль, зусім недасведчаная ні ў рабоце са стрыт-артам, ні ў праектным менеджменце, але вельмі матываваная.

Даведаліся, што Агенцтва рэгіянальнага развіцця «Дзедзіч» праводзіць конкурс мінігрантаў. Напісалі праект, атрымалі фінансаванне і прыступілі да яго рэалізацыі. І вось тут мы сутыкнуліся з праблемай выбару. Звычайна з ёй сутыкаюцца ў краме, а не ў мастацтве: цудоўных беларускіх твораў было настолькі багата, што мы проста не ведалі, якія ж з гэтых тысяч вершаў павінны апынуцца на сценах. Не кажучы ўжо пра тое, з якіх трэба распачынаць. Выйсце знайшлі ў дэмакратыі. Нехта з каманды прапаноўваў свой верш, мы яго абмяркоўвалі, потым галасавалі, так і склалі наш шорт-ліст, які потым скарацілі да трох твораў таксама дэмакратычным шляхам. У ім апынуліся патрыятычны «Санет» Максіма Багдановіча, лірычныя вершы Ніны Мацяш «Без цябе» і Генадзя Бураўкіна «Атруці мяне вясновым хмелем».

Матываваная каманда з грашыма і эскізамі на руках, поўная жадання рабіць тут і зараз. Што можа пайсці не так? Мы не разлічылі час на бюракратычныя працэдуры, не ведалі ўмоў для малявання, пры якой тэмпературы рабіць гэта на вуліцы ўжо немагчыма. І ўсё ж такі ў Брэсце на сценах з'явіўся «Санет», які распавядае пра нацыянальнае адраджэнне, верш Ніны Мацяш, што адлюстроўвае ўсю горыч страты, і верш Генадзя Бураўкіна, які перадае ўсю адданасць каханню. На гэтым вырашылі не спыняцца і цяпер збіраем грошы на новыя муралы ўжо праз краўдфандынг, а ідэі вершаў нам можна прапанаваць у «Інстаграме» (праект #vershybrest) або даслаць на пошту. Ці збіраемся спыняцца на Брэсце? Не хачу загадваць, але было б неверагодна, калі б людзі ў розных гарадах маглі штодня бачыць перад вачыма вершы нашых паэтаў, разумець пачуццёвасць і прыгажосць літаратурнага мастацтва. З дапамогай стрыт-арту гэта магчыма...

## РАМАНТЫЧНАЕ СПАТКАННЕ Ў... МУЗЕІ

**Вучаніца віцебскай сярэдняй школы № 12 Настасся КУНДЗІР** прыйшла ў чырвоны круг TEDxYouth@Minsk з ідэяй стварэння інтэрактыўнага сэрвісу, які дапаможа скласці індывідуальны маршрут па музеях.



Настасся Кундзір: «Рамантычны настрой? Чаму б не замовіць экскурсію пра Марка Шагала і яго Бэлу?»

— Учора ў Луўры паўгадзіны разглядала знакамітую Мону Лізу. Пазаўчора гуляла па музеі Ван Гога, а два дні таму была ў «Метраполітэн» у Нью Ёрку. Больш за ўсё мяне зацікавілі Дэга і Манэ, — расказвае дзяўчына — Як у мяне гэта атрымалася? Дзякуючы інтэрнэту... Віртуальныя экскурсіі ёсць на сайтах многіх устаноў, а ў сэрвісе Google Arts&Culture можна не проста прайсціся па залах, але і наблізіць карціну, разгледзець кожны мазок мастака ці прымерыць, як твор выглядаў бы на сцяне майго пакоя. І вось я гляджу на ўсё гэта і думаю: калі віртуальныя музеі будуць развівацца з такой хуткасцю, калі ў нас будзе магчымасць, не выходзячы з пакоя, вывучаць сусветнае мастацтва, ці не перастануць людзі наведваць музеі рэальныя? Калі націскам адной кнопкі можна трапіць у самыя знакамітыя музеі свету і выбраць экспанаты, якія цікавяць найбольш? Ці не прайграе рэальны музей віртуальнаму? У адрозненне ад віртуальнай рэальная экскурсія ўздзейнічае не толькі на зрок, але і на іншыя органы пачуццяў. Нават слых працуе ў музеі па-іншаму: адсутнасць гукаў таксама стварае асаблівую атмасферу. Вы скажаце, што ў віртуальным музеі таксама можна паслухаць экскурсавода, але ж запіс ніколі не зраўняецца з эмацыянальнай прамовай. У інтэрнэце ён запісаны адзін раз для ўсіх, а ў рэальным жыцці экскурсавод бачыць жывых людзей, рэагуе на рэплікі наведвальнікаў, так нараджаюцца пытанні, адказы, размовы, абмеркаванні. Мы абмяняемся не толькі словамі — мы абмяняемся эмоцыямі!

Успомніце, як вы заходзіце на YouTube. Дапусцім, шукаеце новы фільм: вы ўключылі яго, але ўжо на другой хвіліне прагляду разумееце, што ён вам нецікавы. Што вы зробіце? Выключыце націскам адной кнопкі. Магчымасць выбару дазваляе вам, не прыкладаючы асаблівых намаганняў, атрымаць асалоду ад убачанага.

Цяпер вернемся да музеяў. Віртуальнае наведванне дазваляе адным клікам мышкі перанасіцца з аднаго месца ў іншае, пры гэтым не страціўшы ўвагі. А як адбываецца на экскурсіі рэальнай? Школьнікаў доўга водзяць з залы ў залу, і магчымасці выбару ў іх няма. За цябе ўжо вырашылі, які павінен быць твой маршрут, і не мае значэння, цікава табе ці не. Часам так не хапае той самай кнопкі «Пераключыць». Вось такую кнопку я і прапаную пазычыць. Бо, каб прыцягнуць сучасную моладзь, трэба даць магчымасць выбіраць.

Настасся расказала, што цяпер са сваёй камандай працуе над праграмай, які дазволіць знайсці патрэбны музей, экспазіцыю ці выстаўку пры дапамозе індывідуальнай карты. Як гэта выглядае ў дачыненні да музея?

— Запускаем праграму, выбіраем пэўны населены пункт. Далей асноўная частка праграмы — невялічкі тэст. Адказваем на пытанні, і праграма на аснове нашых інтарэсаў складае спіс музеяў, якія варта наведаць. Адзначаем упадабаныя месцы, складаем маршрут, захоўваем яго ў тэлефоне, і можна распачынаць сваё незабыўнае падарожжа, — тлумачыць дзяўчына. — Напрыклад, як правесці рамантычнае спатканне ў маім дарагім Віцебску? У вас зусім няма ідэй, як зрабіць сустрэчу незабыўнай? На жаль, многія ў такой сітуацыі пра музей увогуле не задумваюцца, бо мы ўспрымаем іх як дадатак да школьнай праграмы. Але ж ідэй для спаткання можна знайсці шмат. Рамантычны настрой? Чаму б не замовіць экскурсію пра Марка Шагала і яго Бэлу... Хочацца чагосьці больш гуллівага? Запрашаем на мастацкую выстаўку, дзе галоўнымі героямі з'яўляюцца каты, ці проста разам пасядзець у старым трамвайчыку ў музеі віцебскага трамвая. Варыянтаў можа быць шмат. З іншага боку, як мне падаецца, калі музеі будуць працаваць больш актыўна — уводзіць новыя экскурсіі, у тым ліку з вузкай тэматыкай, незвычайныя маршруты па экспанатах, якія нейкім чынам звязаныя паміж сабой, — тады і ў школьнікаў з'явіцца жаданне прыходзіць туды. Выбар — гэта тое, чаму рэальныя музеі маглі бы крыху падвучыцца ў віртуальных, каб стаць яшчэ больш цікавымі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

### ЯКІЯ ЯШЧЭ ІДЭІ БЫЛІ АГУЧАНЫ Ў ЧЫРВОНЫМ КРУЗЕ?

Павел АНАНІЧ з Магілёва прапанаваў вяртаць нашым старажытным гарадам страчаныя архітэктурныя шэдэўры з дапамогай тэхналогій дапоўненай рэальнасці.

Канстанцін МУЛІЦА з Іўя ўпэўнены ў тым, што нашы думкі рэгулююць наша жыццё. І знайшоў гэтаму навуковае абгрунтаванне.

Самуіл АЛЕКСІН з Мінска агучыў варыянт пераходу ад інфармацыйнай адукаванасці да робататэхнічнай і прадэманстраваў незвычайныя рабатызаваныя прылады.

Вікторыя СІДАРЭНКА з Гомеля распачала цэлы стартап па вырабе аднаразовага посуду з распаўсюджаных у Беларусі прыродных матэрыялаў і падзялілася сваім бачаннем паляпшэння экалагічнай сітуацыі ў краіне.

Кацярына ЯНГОЛЬ з Крэва расказала, як экалогія яе роднага мястэчка звязана з Балтыйскім морам. У планах Кацярыны і яе аднадумцаў — ачысціць бераг мясцовай рачулкі, пабудаваць драўляны памост і праводзіць там танцавальныя майстар-класы пад жывую музыку.

Софія ФЕДЧАНКА з Мінска прапанавала ўстанавіць спецыяльныя прылады ў вучэбных класах, каб дзеці з захворваннямі апорна-рухальнай сістэмы маглі пазбегнуць ізаляцыі і наведвалі заняткі ў звычайных школах.

Лізавета ГРЫНЮК са Слуцка ўсяго за тры крокі ад ідэі да рэальнасці пераасэнсавала навуковую спадчыну Ніколы Тэслы. Яна распрацавала канцэпт універсальнай канструкцыі бесправадной зарадкі і прапанавала свой досвед у пытанні самаматывацыі падчас рэалізацыі асабістай задумкі.

*Даніна пашаны*

# «МНЕ БЛІЗКАЯ ТЭМА ВАЙНЫ...»

## У сталіцы выбралі найлепшага юнкара



**У Мінскім гарадскім інстытуце развіцця адукацыі адбыўся фінал конкурсу сярод юных журналістаў, які праходзіў у рамках штогадовага фестывалю мастацкай і інтэлектуальнай творчасці «Мой Мінск — мая сталіца — творчасці і таленту крыніца!» Сёлета творчае спаборніцтва, якое, дарэчы, праводзіцца ўжо шэсць гадоў, было прысвечана 75-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Вучні розных школ сталіцы сустракаліся з ветэранамі, знаходзілі цікавыя гісторыі ваеннага часу, расказвалі невядомыя факты пра помнікі і музеі вайны.**

Акрамя галоўнай мэты конкурсу — выхавання ў школьнікаў пачуцця патрыятызму — творчае спаборніцтва дало ім магчымасць паспрабаваць сябе ў прафесіі журналіста. Канкурсанты павінны былі браць інтэрв'ю ў цікавых герояў, а потым прадставіць сваю работу журы. Ацэньвалася і арыгінальнасць тэмы, і якасць публіцыстычнага матэрыялу.

Пераможцам стала вучаніца 10 класа гімназіі № 38 Аляксандра Ванюшына. Школьніца ўзяла інтэрв'ю ў ветэрана Генадзя Уладзіміравіча Юшкевіча. Журы ў складзе выкладчыкаў факультэта журналістыкі БДУ і журналістаў высока ацаніла работу Аляксандры. «Мае бацькі — ваенныя, і мне вельмі блізкая тэма вайны. Таму калі я даведалася пра гэты конкурс, адразу вырашыла ўдзельнічаць. У мяне даўно была мара — пагаварыць з адным з людзей, якім мы зараз абавязаны сваім жыццём і свабодай. З выбарам героя мне дапамог тата, вельмі хацелася знайсці чалавека з незвычайным лёсам. Генадзь Уладзіміравіч з 15 гадоў удзельнічаў у баявых заданнях у складзе дыверсійнай групы. Мне цяпер таксама 15 гадоў, і я не магу нават уявіць сябе на яго месцы. Прызнацца шчыра, хоць пісаць я люблю даўно, але конкурснае інтэрв'ю стала маёй першай работай такога плана. А конкурс мне было важна выйграць дзеля майго героя. Для яго вайна — цэлае жыццё. І ўсведамленне таго, што сучаснаму пакаленню неабыякавая гэтая тэма, было для яго настолькі важнае, што нават апісаць цяжка. Але я пастаралася», — расказала Аляксандра.

Журы высока ацаніла і астатнія работы, дало карысныя парады і запрасіла ўсіх канкурсантаў пасля школы паступаць на факультэт журналістыкі БДУ.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

*Трэці працоўны*

# У СТУДАТРАДАХ — БОЛЬШ ЗА 17 ТЫСЯЧ БАЙЦОЎ

**Менавіта такую колькасць Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі сёлета працаўладкаваў у складзе студэнцкіх атрадаў. У рамках круглагадовай працоўнай занятасці ў 1353 студэнцкія атрады ўсіх сямі зацверджаных профіляў патрапілі 17 827 байцоў, таксама была аказана дапамога ў індывідуальным працаўладкаванні 284 хлопцам і дзяўчатам. Такім чынам, фактычна было больш за 18 тысяч працаўладкаваных. Самая вялікая колькасць іх у Гродзенскай вобласці — 4154 чалавекі ў складзе 301 атрада.**



У студатрадаўскім руху ўдзельнічаюць і школьнікі. Па ўказе Прэзідэнта яны маюць права на працу ў студэнцкіх атрадах з 14 гадоў. Такім чынам, да папулярнага маладзёжнага руху далучыліся 8119 непаўналетніх. З іх працаўладкаваны 512 падлеткаў, якія стаяць на прафілактычным уліку ў інспекцыях па справах непаўналетніх, і 170 знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, паведамляе БРСМ.

Сёлета трэці працоўны семестр стартаваў 28 чэрвеня. За гэты час удалося рэалізаваць два маштабныя працоўныя праекты. Гэта Усебеларуская маладзёжная будоўля «Горад маладосці» — будаўніцтва Беларускай атамнай электрастанцыі і аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры Астраўца, і міжнародны вытворчы працоўны праект «Атлант-2020». Таксама байцы працавалі на абласных і мінскай гарадской маладзёжных будоўлях. Напрыклад, на будаўніцтве агульнаадукацыйнай сярэдняй школы на 1020 месцаў у Баранавічах, сярэдняй агульнаадукацыйнай школы ў Гомелі, на рэканструкцыі комплексу будынкаў гарадской клінічнай бальніцы № 3 у Гродне, паліклінікі для дарослых і дзяцей у Магілёве. У сталічным рэгіёне абласной маладзёжнай будоўляй стаў дашкольны цэнтр развіцця дзіцяці ў гарадскім пасёлку Івянец Валожынскага раёна.

Трэці працоўны семестр працягваецца. Увосень па плане будуць працаваць прыкладна 122 атрады з 2544 чалавек. Сельгасатрады прыступілі да справы ва ўсіх рэгіёнах, але дагаворы на фарміраванне працягваюць заключацца. У цэлым па краіне ў верасні—кастрычніку байцы студэнцкіх атрадаў будуць займацца ўборкай і сартаваннем бульбы і іншых караняплодаў, зборам яблыкаў, уборкай лёну.

Да прыкладу, у Брэсцкай вобласці працуюць пяць сельскагаспадарчых атрадаў. Хлопцы і дзяўчаты збіраюць яблыкі ў ААТ «Батчы», «Лядзецкі», «Імянінскі», РУП «Брэсцкая абласная сельскагаспадарчая доследная станцыя Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», КСУП «Беражное». У Віцебскай вобласці працуюць 30 сельскагаспадарчых атрадаў. Іх байцы ўбіраюць і сартуюць сельгаспрадукцыю ў філіялах «Вясна-энерга» і «Цяплічны» РУП «Віцебскэнерга», РУП «Талачынскі кансервавы завод», ВК «Альгоўскае», ААТ «Навасёлкі-Лучай», «Хацілы-Агра», «Камайскі-Агра». У Гродзенскай вобласці працуюць 35 сельгасатрадаў. Маладыя людзі шчыруюць на палях КСУП «Маларастаўская элітная гаспадарка», «Мацвееўцы», «Эксперыментальная база «Кастрычнік», ААТ «Прынёманскі», Іўеўскага дзяржаўнага прафесійнага ліцэя, Навагрудскага дзяржаўнага сельскагаспадарчага прафесійнага ліцэя.

Закрыццё трэцяга працоўнага семестра запланавана на 13—15 лістапада ў Рэспубліканскім гарналыжным цэнтры «Сілічы» падчас Усебеларускага злёту студэнцкіх атрадаў «Час руху». У гэты ж час пачнецца падрыхтоўка да новага працоўнага праекта для ўдзельнікаў студатрадаўскага руху «Зімовы маршрут» і міжнароднага праекта «Снежны дэсант», які пройдзе на тэрыторыі Расіі і Казахстана.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**



*У дапамогу руплівым*

# Грантаў шмат не бывае

**Wargaming павялічыў колькасць стыпендый для студэнтаў БДУ.**

Усяго будзе выдзелена 24 гранты і пашыраны спіс факультэтаў-удзельнікаў. З гэтага года конкурс пройдзе сярод студэнтаў другога—чацвёртага курсаў біялагічнага, механіка-матэматычнага, фізічнага, хімічнага факультэтаў, а таксама факультэтаў радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій, прыкладной матэматыкі і інфарматыкі.

Кандыдатам неабходна мець высокі бал паспяховасці, падрыхтаваць матывацыйнае эсэ, аўтабіяграфію, а таксама займацца навукова-даследчай дзейнасцю. Стыпендыя прысуджаецца на бягучы навучальны семестр, удзельнічаць у конкурсе можна неабмежаваную колькасць разоў. Вынікі будуць падведзены на пасяджэнні камітэта стыпендыі 5—6 кастрычніка бягучага года.

Нагадаем, конкурс на атрыманне стыпендыі ад вядучага стваральніка камп'ютарных гульняў праводзіцца ў БДУ з 2019 года чацвёрты раз. Ён скіраваны на стымуляванне і матывацыю моладзі да навуковай дзейнасці. Раней у рамках конкурсу выдзялялася 16 стыпендый.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*У ліку найлепшых*

# Запраграмаваныя на поспех

**Беларускія школьнікі ўдала выступілі на 32-й Міжнароднай алімпіядзе па інфарматыцы.**

International Olympiad in Informatics, IOI — адны з найбольш прэстыжных інтэлектуальных спаборніцтваў вучняў па праграмаванні. Сёлета ў іх узялі ўдзел 343 навучэнцы з 87 краін свету. Алімпіяда праходзіла з выкарыстаннем дыстанцыйных (інфармацыйна-камунікацыйных) тэхналогій. Яе арганізатарам выступіла міністэрства адукацыі Рэспублікі Сінгапур.

Згодна з правіламі правядзення алімпіяды, навучэнцы спаборнічаюць індывідуальна. Ад кожнай краіны можа быць прадстаўлена не больш за чатыры ўдзельнікі. Алімпіяда праходзіць у два туры, у кожным з іх навучэнцы рашаюць па тры задачы з выкарыстаннем некалькіх моў праграмавання. На выкананне задання адводзіцца па пяць гадзін у кожным туры.

Каманда Рэспублікі Беларусь складалася з чатырох удзельнікаў — пераможцаў заключнага этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбным прадмеце «Інфарматыка» 2019/2020 навучальнага года.

Па выніках удзелу ў міжнароднай алімпіядзе сярэбраны медаль заваяваў Андрэй Мішчанка (выпускнік сярэдняй школы № 13 Мазыра, выхаванец Цэнтра юных пажарных). Бронзавых узнагарод удастоены Яраслаў Барысаў (выпускнік гімназіі № 8 Віцебска) і Павел Санкін (выпускнік Ліцэя Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта).

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Хлопцы справы*

# Унёсак у агульны каравай

**Вызначаны абсалютныя пераможцы рэспубліканскага праекта «Моладзь — за ўраджай».**

Сярод маладзёжных экіпажаў лідзіруюць Леанід Аляксеенка і Сяргей Каўбасаў з Віцебскай вобласці, якія намалацілі 5071 тону збожжа. Камбайнер Віктар Мяцеліца з Мінскай вобласці намалаціў 3436 тон. На рахунку сямейнага экіпажа Андрэя і Сяргея Драздоў з Магілёўскай вобласці — 3145,6 тоны. У Брэсцкай вобласці найлепшымі сталі Андрэй Есьман і Аляксандр Філончык, якія намалацілі 2627,2 тоны. Намалот сямейнага экіпажа Вадзіма і Алега Лабовічаў з Гродзенскай вобласці — 2599,35 тоны збожжа. У Гомельскай вобласці ў лідарах Дзмітрый Ляшчынскі і Раман Данілік, якія намалацілі 1736,9 тоны.

Сярод маладых кіроўцаў лідарам стаў Павел Ціханаў з ААТ «Амкадор-Шклоў» Магілёўскай вобласці, які перавёз 4805 тон збожжа. У Мінскай вобласці найлепшым стаў Дзяніс Гнілазуб з ААТ «Гарадзілава»: яго вынік — 4120,8 тоны. У Брэсцкай Міхаіл Кучко з ААТ «Белавежскі» перавёз 3477,4 тоны. На рахунку ва Уладзіслава Карпушэнкі з СГФ «Смальяны» ААТ «Аршанскі КХП» Віцебскай вобласці — 3475 тон збожжа. Аляксандр Багдановіч з КСУП «Саўгас «Багдановічы» Гомельскай вобласці перавёз 3308,6 тоны збожжа, а Іван Свідзінскі з СВК «Зарэчны-Агра» Гродзенскай вобласці — 3065 тон збожжа.

Усяго маладзёжныя экіпажы намалацілі 865 558,745 тоны збожжа, маладыя кіроўцы перавезлі 750 003,734 тоны.

Арганізатарам рэспубліканскага праекта «Моладзь — за ўраджай» выступае БРСМ. Спаборніцтвы праходзяць у намінацыях «Маладзёжны экіпаж камбайнераў, які дасягнуў найбольшага намалоту» і «Малады кіроўца, які перавёз найбольшую колькасць збожжа».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
01 10 2020 г.

*Бачыць мэту*

# ГАВАРЫЦЬ І БЫЦЬ ПАЧУТЫМ

**У форуме «Беларусь — гэта мы» ў Магілёве прынялі ўдзел каля чатырох тысяч маладых людзей з усёй вобласці.**

«Вы сабраліся тут, каб адкрыта і прама выказаць сваю грамадзянскую пазіцыю, аб'ядналіся, каб стаць на абарону галоўных дасягненняў такой жа, як вы, маладой і незалежнай краіны, — зачытаў падчас урачыстага адкрыцця форуму зварот ад Прэзідэнта **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэй КУНЦЭВІЧ.** — Няма нічога даражэй за мір, бяспеку і свабоду, за якія нашы продкі ў розныя гады аддавалі свае жыцці... Вы ўжо ўвайшлі ў гісторыю як пакаленне першай суверэннай беларускай дзяржавы і павінны заставацца ў ёй як патрыёты, якія ў няпросты час з гонарам прайшлі выпрабаванне на трываласць, захавалі вернасць спрадвечным традыцыям і зберагалі родны дом — Беларусь».



У ініцыятыўных была магчымасць выказацца падчас адкрытага дыялогу.

За некалькі гадзін да адкрыцця мерапрыемства ў Лядовым палацы можна было наведаць своеасаблівую выстаўку дасягненняў моладзі і даведацца пра ўсё, чым яна сёння дыхае. А кірункаў шмат — валанцёрскі, навуковы, будатрадаўскі... Дарэчы, за 9 месяцаў з пачатку года праз студэнцкія будаўнічыя атрады паспелі прайсці 18 тысяч хлопцаў і дзяўчат. Узяць, напрыклад, будатрад «Маладосць» Магілёўскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта харчавання — лічыцца, што трапіць у яго вельмі прэстыжна. Летась ён абслугоўваў ІІ Еўрапейскія гульні ў Мінску, сёлета стаў найлепшым на міжнародным вытворчым працоўным праекце «Атлант-2020». «Ветэранамі» ў будатрадаўскім руху становяцца хутка: тры гады адпрацаваў — і ты ўжо загартаваны баец. Чацвёртакурсніца ўніверсітэта харчавання Таццяна Дзенісенка якраз адна з такіх «ветэранаў».

— Студэнцкі будатрадаўскі рух — гэта своеасаблівае брацтва, магчымасць знайсці новых сяброў і набрацца ўражанняў, — кажа яна. — А яшчэ — плённа папрацаваць на добры вынік разам. Гэта вельмі аб'ядноўвае.

У актывістаў маладзёжнага руху была магчымасць выказацца падчас «Адкрытага дыялогу» або накіраваць свае прапановы праз электронную платформу.

— Цікава даведацца, што думае моладзь, чаго ёй не хапае, што магчыма было б змяніць, — разважае **першы сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Дзмітрый ВАРАНЮК.** — Перамены патрэбны, але ўсё павінна ісці праз дыялог, цывілізавана і канструктыўна. Самыя цікавыя прапановы будуць агучаны Прэзідэнту.

— Моладзь сёння выказвае розныя погляды, у тым ліку і палітычныя, іх таксама трэба ўлічваць, — перакананы **старшыня маладзёжнага парламента пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь Ягор МАКАРЭВІЧ.** — Форум дасць магчымасць вызначыцца наконт нашага агульнага будучага. Мы стаім на парозе значных палітычных падзей — Усебеларускага народнага сходу, канстытуцыйнага рэфармавання, — і голас моладзі павінен быць пачуты. Мы прапаноўваем шэраг ініцыятыў па карэкцыроўцы Асноўнага Закона, канкрэтныя ініцыятывы па ўцягванні моладзі ў эканоміку, новыя вытворчыя пляцоўкі. Маладзёжныя форумы стануць месцам для дыскусій, дапамогуць скласці павестку будучага, каб краіна магла паспяхова рухацца наперад.

Форум у Магілёве даў старт аналагічным мерапрыемствам па ўсёй краіне.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**

*Вехі гісторыі*

# Франтавы дзённік, парадная шашка і скафандр касманаўта

**У Мінску пасля рэканструкцыі адкрыўся Музей гісторыі камсамола і маладзёжнага руху Беларусі. Тут сабрана больш за 20 тысяч гістарычных дакументаў, фатаграфій і рэчаў, сярод якіх ёсць і ўнікальныя. У экспазіцыі прадстаўлена толькі малая частка — каля 1,5 тысячы экспанатаў. Гэта дакументы і прадметы перыяду стварэння камсамольскіх ячэек, ваеннага ліхалецця, аднаўлення народнай гаспадаркі ў пасляваенны перыяд, зараджэння студатрадаўскага і фестывальнага рухаў — да дзейнасці БРСМ на сучасным этапе.**



Піянерская форма савецкага школьніка.

...Гальштукі, якія насілі першыя піянеры, былі зроблены на чыгуначным вузле ў Оршы. Цяпер мы можам убачыць адзін з іх тут, у музеі. Побач і «Сяброўскі білет» камсамольца 1920 года.

Найбольш каштоўныя экспанаты, як кажа **кіраўнік музея Святлана САСНІНА,** гэта ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга і ордэн Леніна, якімі быў узнагароджаны Ленінскі Камуністычны Саюз Моладзі Беларусі за заслугі перад Радзімай у гады Вялікай Айчыннай вайны, партызанскі рух, працоўныя дасягненні ў 1945 і 1970 гадах.

Выстаўлена калекцыя ўзнагарод ЦК Усесаюзнага Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі, прадстаўленая старшынёй Мінскай гарадской арганізацыі ветэранаў вайны ў Афганістане Уладзімірам Шокавым, які быў узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, «За службу Радзіме ва Узброеных Сілах СССР» ІІІ ступені, «Зоркай» Дэмакратычнай Рэспублікі Афганістан ІІІ ступені і шматлікімі медалямі. У экспазіцыі — каля 150 знакаў, значкоў і медалёў, сярод якіх членскі значок «КІМ» (Камуністычны інтэрнацыянал моладзі) 1922—1945 гадоў, значок «Школа камсамольскага актыву» 1922 года, знакі ЦК ВЛКСМ «Воінская доблесць», «Працоўная доблесць», «Залаты колас», «Настаўнік моладзі», «Малады гвардзеец пяцігодкі» і многія іншыя. Дарэчы, збіраў ён гэтую калекцыю на працягу больш чым 50 гадоў з 1958 да 1991-га.

Самаробны франтавы дзённік байца Чырвонай Арміі Івана Сабко... Замест вокладкі — дзве металічныя пласціны ад ваеннай тэхнікі.



Інсталяцыя «Падпольны райкам камсамола»: сапраўдныя гімнасцёрка, сумка, партызанскі дзіракол, тэлефон 1943 года выпуску.

Замест старонак — тэлеграфныя бланкі з франтавымі запісамі, аўтарскімі вершамі, напісанымі алоўкам, а таксама ліст да бацькоў. Ураджэнец Палесся, які абараняў Радзіму ад ворага, так і не вярнуўся дадому. У чэрвені 1945 года ён загінуў падчас баёў у Германіі. Таварышы захавалі дзённік хлопца і перадалі яго родным. Вось што Іван пісаў 9 мая 1945 года: «Добры дзень, мае бацькі. Паведамляю пра тое, што я жывы, здаровы, і вам гэтага жадаю. Шмат пісаць не думаю, сёння святкуем мы далёка, на германскай тэрыторыі. Вайна скончана, мы перамаглі. Віншую вас з Перамогай над нямецкім фашызмам. Ваш сын Ваня Сабко».

Унікальны экспанат — парадную шашку — падарыў Цэнтральнаму камітэту ЛКСМБ савецкі палкаводзец, двойчы Герой Савецкага Саюза, кавалер сямі ордэнаў Леніна Маршал Савецкага Саюза Іван Баграмян. Лічыцца, што менавіта яна была пры ім падчас Парада Перамогі ў Маскве 24 чэрвеня 1945 года. Іван Баграмян удзельнічаў у вызваленні Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Падчас стратэгічнай наступальнай аперацыі, якая атрымала кодавую назву «Баграціён», першымі выступілі войскі 1-га Прыбалтыйскага фронту на чале з Баграмянам.

Яшчэ адна каштоўная рэч — працоўная кніжка савецкага беларускага партыйнага і дзяржаўнага дзеяча Пятра Машэрава. У 1947—1954 гадах ён быў сакратаром ЦК ЛКСМБ. А таксама сумка, акуляры і іншыя рэчы савецкага ваеннага лётчыка, Героя Савецкага Саюза Аляксандра Новікава. У паветраных баях з ворагам ён праявіў гераізм і адвагу. На самалёце І-16 здзейсніў 93 баявыя вылеты, удзельнічаў у дзясятках паветраных сутычак. Усяго за перыяд з 17 студзеня да 9 сакавіка 1942 года асабіста і ў групавых баях знішчыў 15 варожых самалётаў.

Пасля вызвалення Беларусі камсамол актыўна ўключыўся ў мірную дзейнасць: маладыя хлопцы і дзяўчаты ўдзельнічалі ў аднаўленні Мінска — два разы на тыдзень прыходзілі і прыбіралі ўсё, што было разбурана падчас вайны, а таксама нанова будавалі хаты ў вёсках і пасёлках.

У красавіку 1974 года Усесаюзнай ударнай будоўляй была абвешчана пракладка Байкала-Амурскай магістралі (адна з найбуйнейшых чыгунак у свеце). У 1984 годзе яе цалкам пабудавалі, што стала важнай падзеяй у гісторыі камсамола.

**Самаробны франтавы дзённік байца Чырвонай Арміі Івана Сабко... Замест вокладкі — дзве металічныя пласціны ад ваеннай тэхнікі.**

...Фотаздымак, які нагадвае нам пра гісторыю, звязаную з геранічным учынкам 17-гадовага камсамольца Мішы Мароза, пераносіць нас у верасень 1977 года. Менавіта тады навучэнцы Аршанскага індустрыяльна-педагагічнага вучылішча, у тым ліку і гэты юнак, працавалі ў калгасе «Прагрэс» Дубровенскага раёна. Хлопец убачыў, што разам з бульбянымі клубнямі знаходзіцца артылерыйскі снарад, схапіў яго і хутка пабег праз поле да яра. Не паспеў дайсці ўсяго некалькі метраў — і смертаносная знаходка выбухнула ў яго ў руках. Такім чынам ён выратаваў ад пагібелі каля 30 чалавек, якія знаходзіліся на полі. За мужнасць Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР пасмяротна ўзнагародзіў смелага камсамольца ордэнам Чырвонай Зоркі. Імя Міхаіла Мароза было занесена ў Кнігу Пашаны цэнтральных камітэтаў ВЛКСМ і ЛКСМ Беларусі, а ў яго камсамольскім білеце застаўся запіс: «Вынес з поля баявы снарад, адвёў ад людзей бяду цаной уласнага жыцця».

У музеі знаходзіцца сапраўдны скафандр першага беларускага касманаўта Пятра Клімука, у ім ён здзейсніў сваё апошняе трэцяе касмічнае падарожжа. Святлана Сасніна падзялілася, што многія, хто бачыць яго, не вераць, што Пётр Клімук такога невысокага росту, прыкладна 165 сантыметраў — на борце касмічнага карабля, дарэчы, гэта з'яўляецца перавагай.

Наступная старонка развіцця камсамольскага руху — фестывальная. Яна пераносіць нас у 1950-я гады. Канцэрты, маршы, мітынгі... Працягвае гэтыя традыцыі і сучасная моладзь, нашы хлопцы і дзяўчаты пабывалі на апошнім, XIX Сусветным фестывалі моладзі і студэнтаў, які прайшоў у Сочы ў 2017 годзе.

— Вы можаце ўбачыць маладых людзей — пераможцаў сацыялістычнага спаборніцтва, якія развівалі нашу прамысловасць. Гэта вельмі важна сёння ўспамінаць моладзі, каб разумець тое, як будаваць будучыню. Трэба і цяпер аддаваць вялікую ўвагу нашай краіне, каб яна станавілася больш прыгожай і квітнеючай, — лічыць Святлана Сасніна.

Асновы і прынцыпы камсамольскага руху ў 2002 годзе пераняў Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі. Яго шматлікія праекты, такія, як «Кветкі Вялікай Перамогі», «Мы — грамадзяне Беларусі», «100 ідэй для Беларусі», маладзёжны марафон «Зрабі свой выбар», «Аднаўленне святынь Беларусі» і іншыя дапамагаюць захаваць пераемнасць пакаленняў.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**
**Фота дадзена БРСМ.**

*Новыя старты*

# Адчуць сябе спартыўным каментатарам

**Беларускія школьнікі да 15 кастрычніка могуць падаць заяўкі на ўдзел у міжнародным конкурсе юных каментатараў ва ўзроставай катэгорыі 9—14 гадоў у сацыяльных сетках Facebook, Instagram і Youtube у рамках міжнароднага праекта «Футбол для дружбы».**



Дзеці з нашай краіны традыцыйна прымаюць удзел у міжнароднай дзіцячай сацыяльнай праграме «Футбол для сяброўства». Восьмы сезон праграмы аб'ядnae больш за 10 тысяч удзельнікаў з усяго свету і пройдзе ў анлайн-фармаце.

У новым сезоне працягне работу міжнародны дзіцячы прэс-цэнтр, дзе ўдзельнікі паспрабуюць сябе ў ролі спартыўных журналістаў і будуць асвятляць падзеі праграмы ў сваіх краінах, рыхтаваць навіны для нацыянальных і міжнародных спартыўных СМІ. У гэтым годзе міжнародны дзіцячы прэс-цэнтр абвясціў анлайн-конкурс юных каментатараў, пераможцы якога будуць каментаваць анлайн-чэмпіянат праграмы «Футбол для дружбы».

Паводле слоў першага намесніка міністра інфармацыі Паўла Лёгкага, анлайн-фармат падчас пандэміі, як у выпадку з «Футболам для дружбы», дае магчымасць дзецям з розных куткоў краіны даведацца больш пра любімую гульню і знайсці аднадумцаў сярод равеснікаў з усяго свету — і ўсё гэта з бяспекай для здароўя. «Цудоўна, што гэты праект абуджае цікавасць да журналісцкай прафесіі і нават дае рэальныя навыкі: дапамагае дзецям паспрабаваць сябе ў якасці спартыўнага каментатара, зразумець працэсы вытворчасці журналісцкіх матэрыялаў розных фарматаў, пагутарыць з вядомымі спартсменамі і расказаць аб любімай гульні, якая аб'ядноўвае людзей з усяго свету», — сказаў Павел Лёгкі.

**• Даведка**

Міжнародная дзіцячая сацыяльная праграма «Футбол для дружбы» рэалізуецца «Газпрамам» з 2013 года. За сем сезонаў яна ахапіла 211 краін і рэгіёнаў, аб'яднала больш за 6 тысяч удзельнікаў і набыла звыш 5 мільёнаў прыхільнікаў.

Прадстаўнікі Беларусі бяруць удзел у міжнароднай дзіцячай сацыяльнай праграме «Футбол для дружбы» з 2014 года. У сёмым сезоне праекта Беларусь прадстаўлялі чатыры юныя футбалісты: Сафія Мяцельская і Яна Сташкова, выхаванкі футбольнага клуба «Minsk Ladies», і Ганна Гадзінская і Мелана Сураўцава, выхаванкі футбольнага клуба «Мінск».

Для ўдзелу ў конкурсе дзецям неабходна зняць відэа, у якім трэба пракаментаваць на англійскай мове ўрывак футбольнага матча даўжынёй у адну хвіліну, адным дублем, без мантажу, і выкласці ролік у сацыяльных сетках з хэштэгам #F4FCommentator з указаннем свайго ўзросту і краіны пражывання.

Конкурс пройдзе ў два этапы. На першым — да 15 кастрычніка — будуць адабраны найлепшыя каментатары ў кожнай краіне. На другім — да 9 лістапада — пройдзе анлайн-галасаванне па выбары пераможцы. Вынікі конкурсу будуць падведзены 15 лістапада. Яго ўдзельнікі атрымаюць каштоўныя прызы ад міжнароднай дзіцячай сацыяльнай праграмы «Футбол для дружбы»: набор прафесійнага стрымінгавага аўдыё- і відэаабсталявання і сувеніры з сімволікай праекта.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# АНЛАЙН ШТОДНЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Таксама insta-блогеры, акрамя колькасці падпісчыкаў, вылучаюцца яшчэ і сваёй накіраванасцю. Самыя папулярныя тэмы, якія падымаюць блогеры на сваіх старонках, — фітнес, багатае жыццё, падарожжы, кулінарыя і, вядома ж, акаўнты знакамітых людзей. Наша суразмоўніца адышла ад стандартных кірункаў і, нягледзячы на малады ўзрост, вырашыла весці блог пра адносіны.

— Свой акаўнт у Instagram я стварыла ў 2014 годзе, але тады гэта была самая звычайная старонка, на якой выкладваліся мае фотаздымкі. Але аднойчы, як і большасць равеснікаў на той момант, мяне пачала цікавіць тэма адносін паміж хлопцамі і дзяўчатамі, да якой дадаліся яшчэ асабістыя перажыванні, і на эмоцыях я напісала свой першы пост на старонцы. Ён быў пра тое, што многія дзяўчаты пры сустрэчы з прыгожым хлопцам, ну, ці проста хлопцам, які ім сімпатычны, пачынаюць накручваць сябе комплексамі і адразу ж здаюцца. Я шмат думала і ў выніку дала ў посце некалькі парад, што трэба і не трэба рабіць, каб не застацца без шанцаў на знаёмства.

> **«Блогерамі спрабуюць стаць вельмі многія, але толькі ў нямногіх гэта атрымліваецца».**

З часу першага поста Ірыны прайшло ўжо нямала часу, яна распрацавала структуру свайго блога, ведае, як і што здымаць, і, дзякуючы ўпартасці і намаганням, заваявала ўвагу новых падпісчыкаў. Блогерка адзначае, што не заяўляе пра сябе, як пра эксперта ў адносінах, яна проста выказвае сваю думку аб спрэчных пытаннях з гэтай сферы, напрыклад, чаму жанчыны часта выстаўляюць сябе ў ролі ахвяры, ці чаму ўсе так баяцца разводу ў сям'і. Акрамя гэтага, Ірына заўсёды чытае рэакцыю сваіх падпісчыкаў на яе посты і любіць, калі яны выклікаюць дыскусію паміж карыстальнікамі. З нядаўняга часу, акрамя звычайных постаў, наша суразмоўніца ўвяла новую рубрыку на старонцы — «Хуткае інтэрв'ю», у якой яна задае розныя пытанні, якія датычацца адносін, групам хлопцаў і дзяўчат, часам выносячы для сябе з іх адказаў вельмі карысную і нечаканую інфармацыю.

> **«Для блогера гэта самае важнае — ведаць, што ты цікавы, што можаш даваць людзям «пажытак» для разважанняў і дыскусіі».**

Ні адзін блогер, нават пачатковец, не абыходзіцца без хэйтараў, людзей якія крытыкуюць тое, што ён робіць. Некаторыя не звяртаюць на іх увагі, іншыя прымаюць такія заўвагі блізка да сэрца, а ёсць і тыя, хто выдаляе гэтыя каментарыі і блакуе такіх карыстальнікаў.

— З крытыкай я сутыкнулася ў самым пачатку свайго шляху. Калі запосціла першы запіс на старонцы, шмат хто пачаў пісаць, што я спрабую быць як усе, а не выказваю свае думкі і што да блогерства мой пост не мае ніякага дачынення. Вядома, улічваючы недасведчанасць і нейкі страх, спачатку вельмі нервавалася. Былі моманты, калі хацела адмовіцца ад жадання стаць insta-блогерам, але кожны раз разумела, што ёсць людзі, каму падабаецца тое, што я раблю, а галоўнае, што гэта падабаецца мне. Цяпер такіх добразычлівых карыстальнікаў нашмат больш, чым было напачатку, я адчуваю іх водгукі. Мне здаецца, для блогера гэта самае важнае — ведаць, што ты цікавы, што можаш даваць людзям «пажытак» для разважанняў і дыскусіі, а часам адказваць на тыя пытанні, якія яны баяліся задаць нават самі сабе. А пісаць у пустэчу — гэта жудасна. Што датычыцца хейтараў, то ў нейкі момант зразумела, што яны зусім не ворагі, а нават наадварот, дзякуючы ім, я магу перагледзець той ці іншы свой крок, знайсці недахопы і наступны пост зрабіць яшчэ цікавейшым.




У самым пачатку мы згадвалі, што большасць успрымае блогерства ў любых сацыяльных сетках як дзіцячую забаву, а не сур'ёзны занятак. Падчас дыялогу наша суразмоўніца шчыра прызналася, што пакуль быць insta-блогерам для яе — хобі, якое яна старанна імкнецца зрабіць сваёй прафесіяй.

> **Блогерка адзначае, што не заяўляе пра сябе, як пра эксперта ў адносінах, яна проста выказвае сваю думку аб спрэчных пытаннях з гэтай сферы.**

— Любы занятак павінен прыносіць заробак, а я пакуль працую па бартары. Наогул, каб стаць прафесійным блогерам, трэба не толькі ўкласці шмат часу, намаганняў і фінансаў, але і валодаць пэўнымі чалавечымі якасцямі. Па-першае, крэатыўнасцю, як ні круці. Блогерства — гэта ў першую чаргу творчасць і самавыяўленне. Па-другое, быць дасведчаным у той тэматыцы, у якой ты вядзеш сваю старонку. Я ўвесь час чытаю нейкія форумы, вывучаю псіхалогію, ну і, вядома ж, назіраю за людзьмі, якія вакол мяне, і іх узаемаадносінамі. Ну, а па-трэцяе, захопленасць. Блогерамі спрабуюць стаць вельмі многія, але толькі ў нямногіх гэта атрымліваецца.

На напісанне аднаго поста можа сысці вельмі шмат часу, прызнаецца суразмоўніца. Пакуль выбераш актуальнае пытанне, абдумаеш яго, разбярэш, зробіш і апрацуеш патрэбныя фота, а калі яшчэ трэба манціраваць відэа... Можа прайсці тыдзень, але быць на вачах у падпісчыкаў трэба штодня, бо калі ты не быў у Instagram дзень, то, лічы, што цябе ўжо ўсе забыліся.

Нягледзячы на тое, што Ірына — блогер-пачатковец, яе часта запрашаюць на розныя мерапрыемствы ў якасці эксперта. І гэта не дзіўна, бо, акрамя вядзення акаўнту пра адносіны, яна з'яўляецца кіраўніком маладзёжнага творчага аб'яднання «Мама, я блогер».

— Яго адкрыла на базе аднаго са сталічных цэнтраў дадатковай адукацыі «Ветразь». Калі шчыра, лічу, што мне моцна пашанцавала, бо я магу не толькі развівацца ва ўлюбёнай сферы сама, але і дапамагаць гэта зрабіць іншым. Аб'яднанне разлічана на падлеткаў і моладзь з трынаццаці да дваццаці аднаго года, хоць, каб стаць блогерам, узроставых рамак няма. Але асабіста мне камфортней працаваць з такой аўдыторыяй. Я вучу яе таму, з чым сама сутыкнулася ў самым пачатку шляху. Дапамагаю пазбавіцца ад комплексаў і сарамлівасці, дапамагаю знайсці тую тэматыку, у якой ім будзе камфортна і цікава. Некаторыя падлеткі часта кажуць мне: «А пра што можна пісаць?», «А як фатаграфавацца?», «Мяне ж будуць чытаць мама і бабуля...» Усе гэтыя моманты мы вырашаем разам.

Часта можна пачуць пра Instagram-залежнасць — гэта калі праводзіш гадзіны за экранам і не можаш пражыць і дня, каб не зрабіць сэлфі і не запосціць яго ў сябе на старонцы. На думку некаторых псіхолагаў, менавіта блогеры знаходзяцца ў зоне рызыкі гэтай «хваробы». Аднак Ірына абвяргае міф.

> **«Адрозненне insta-блогера ад блогераў іншых інтэрнэт-парталаў ці сацыяльных сетак у тым, што яны абавязаны ўзаемадзейнічаць са сваімі падпісчыкамі штодня».**

— Першы час ты і сапраўды сядзіш у сацыяльнай сетцы як зачараваны, але неўзабаве пачынаеш перанасычацца інфармацыяй, і часта блогерам хочацца ўзяць невялікі адпачынак, каб «пачысціць» сваю галаву ад таго патоку навін, што кожны дзень сустракаеш у стужцы. Магчыма, з-за гэтай перанасычанасці ў некаторых з'явілася меркаванне, што Instagram паволі згасае, але ведайце, ён не памрэ ніколі. Мы можам стамляцца ад яго, браць перапынак, але для большасці людзей у свеце ён стаў неад'емнай часткай жыцця.

**Ангеліна НОВІКАВА, студэнтка IV курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.**
**Фота дадзена суразмоўніцай.**

# МАЛАДЗЁЖНЫ ПРАЕКТ: У ДЗЯСЯТАЧКУ!

**Дадзены старт чарговаму, дзясятаму па ліку, сезону рэспубліканскага маладзёжнага праекта БРСМ «100 ідэй для Беларусі». Гэта было зроблена падчас афіцыйнай цырымоніі фінальнага этапу рэспубліканскага маладзёжнага інавацыйнага праекта «Стартап-тур. Інтэнсіў для маладых прадпрымальнікаў».**

Да ўдзелу ў праекце запрашаюць маладых людзей ва ўзросце ад 14 да 31 года, якія займаюцца рацыяналізатарствам, распрацоўкай навукова-тэхнічных і інавацыйных праектаў, што ўяўляюць практычную цікавасць для рэальнага сектара эканомікі. Для маладых навукоўцаў гэты ўзроставы парог складае 35 гадоў.

Прадставіць свае прапановы можна ў дзесяці намінацыях: «Энергетыка, у тым ліку атамная энергетыка, і энергаэфектыўнасць», «Агапрамысловыя тэхналогіі і вытворчасць», «Прамысловыя і будаўнічыя тэхналогіі і вытворчасць», «Медыцына, фармацыя, медыцынская тэхніка», «Хімічныя тэхналогіі, нафтахімія», «Бія- і нанаіндустрыя», «Інфармацыйна-камунікацыйныя і авіякасмічныя тэхналогіі», «Рацыянальнае прыродакарыстанне і глыбокая перапрацоўка прыродных рэсурсаў», «Нацыянальная бяспека і абараназдольнасць, абарона ад надзвычайных сітуацый», «Грамадства, эканоміка і сацыяльная сфера». У кожнай намінацыі будуць вызначаны па два пераможцы ў дзвюх узроставых групах: навучэнцы ўстаноў агульнай сярэдняй, прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі і студэнты, курсанты, слухачы ўстаноў вышэйшай адукацыі, працуючая моладзь, маладыя навукоўцы.

Праект «100 ідэй для Беларусі» рэалізуецца сёлета ў некалькі этапаў. На першым будзе праводзіцца інфармацыйная работа па яго папулярызацыі. Каб атрымаць добры вынік, стаіць задача даць маладым людзям як мага больш звестак. Расказаць, як правільна і куды можна падаваць заяўку, як яе аформіць, каб яна адлюстроўвала ўсе неабходныя моманты. Прыём заявак ужо адкрыты. Іх можна накіраваць наўпрост у тэрытарыяльныя камітэты БРСМ альбо запоўніўшы форму на сайце 100ideas.by. Ужо ў лістападзе пройдзе першы адбор, адбудуцца раённыя і занальныя выстаўкі, а экспертныя саветы вызначаць пераможцаў другога этапу.

У лістападзе — снежні пройдуць абласныя (Мінская гарадская) выстаўкі-прэзентацыі з вызначэннем пераможцаў трэцяга этапу. Нацыянальная акадэмія навук Беларусі праводзіць свой конкурсны адбор з арганізацыяй выстаўкі маладзёжных праектаў. Фінал 10-га сезона праекта запланаваны на люты 2021 года.

Усе фіналісты «100 ідэй для Беларусі» могуць прыняць удзел у рэспубліканскім конкурсе інавацыйных праектаў. З іх 10 праектаў-пераможцаў атрымліваюць грашовыя сродкі ў памеры да 57 базавых велічынь для распрацоўкі бізнес-планаў інавацыйных праектаў у мэтах іх далейшага ўдзелу ў конкурсе ў парадку і на ўмовах, вызначаных Дзяржаўным камітэтам па навуцы і тэхналогіях. Па выніках двух апошніх гадоў 10 пераможцаў прымаюць удзел у міжнародным маладзёжным праекце «100 ідэй для СНД».

Нагадаем, «100 ідэй для Беларусі» рэалізуецца БРСМ пры падтрымцы зацікаўленых у мэтах актывізацыі інавацыйнага мыслення моладзі, прыцягнення яе да вырашэння задач сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

## ПО ПРОДАЖЕ НЕЗАСЕЛЕННОГО ЖИЛОГО ПОМЕЩЕНИЯ,

**принадлежащего на праве собственности ОАО «Савушкина пуща»:**
**жилого дома, расположенного по адресу: Брестская область, Каменецкий район, деревня Тересины, дом 6, общей площадью 38,5 кв. м, на земельном участке площадью 0,2500 га (далее по тексту – Объект)**

Заявление на участие в аукционе принимается в рабочие дни с 8.00 до 17.00, обед – с 13.00 до 14.00 по адресу: Брестская область, Каменецкий район, аг. Ходосы, ул. Советская, 3. Прием заявлений заканчивается 28.10.2020 в 16.00. Контактный телефон 8 (01631) 42 0 27, тел./факс 8 (01631) 42 1 33.

При подаче заявления на участие в аукционе физические лица предъявляют документ, удостоверяющий личность, а представители юридических лиц документ, удостоверяющий их полномочия.

Начальная цена по продаже Объекта составляет сумму в размере 1 616,06 белорусского рубля.

*Сумма задатка составляет 242,41 белорусского рубля и вносится до 28.10.2020 на расчетный счет ОАО «Савушкина пуща» р/с BY89BAPB30126100500110000000 в ЦБУ № 103 в г. Каменец, Региональная дирекция по Брестской области «Белагропромбанк» ОАО, БИК BAPBBY2X, УНП 200193392, ОКПО 03804041.*

**Аукцион состоится 02.11.2020 в 11.00 а актовом зале ОАО «Савушкина пуща» по адресу: Брестская область, Каменецкий район, аг. Ходосы, ул. Советская, 3.**

07.10.2020 г. в 12.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Полесьежилстрой».

Повестка дня:

1) О выборах членов наблюдательного совета.
2) О вознаграждении членов наблюдательного совета.

Местонахождение ОАО «Полесьежилстрой»: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.

Место проведения собрания: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.

Время регистрации в день проведения собрания – с 11.30 до 12.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность). Дата сбора реестра акционеров – 01.10.2020 г.

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни начиная с 01.10.2020 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

Наблюдательный совет.

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» (продавец) в лице ликвидатора ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» – директора ООО «Модель антикризисного управления» Куценковой Н. С. извещает о проведении 13 октября 2020 года открытого повторного аукциона по продаже имущества со снижением начальной цены на 70 % в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Условие продажи:** Победитель (единственный участник) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. Действия по снятию с регистрационного учета транспортных средств (автотехники и механизмов), а также в случае необходимости получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производятся Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом, за его счет и его силами. Переоформление документов на автотехнику и механизмы производится за счет покупателя. **Местонахождение:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8 | | | |
| 1 | Аппарат газированной воды «Полесье» АП-60, инв. № 61380 | **450,00** | 45,00 |
| 2 | Аппарат для приварки шпилек RSR2500, инв. № 61355 | **570,00** | 57,00 |
| 3 | Печь электротермич. СШЦМ, инв. № 40127 | **6 060,00** | 606,00 |
| 4 | Пресс К-1930, инв. № 50164 | **1 710,00** | 171,00 |
| 5 | Пресс гидравлический П6332Б, инв. № 50161 | **5 820,00** | 582,00 |
| 10 | Пресс КЕ-2330, инв. № 60350 | **1 800,00** | 180,00 |
| 16 | Эл. печь СНЗ-3.6, инв. № 40125 | **1 080,00** | 108,00 |
| 20 | Пресс гидравлич. П6330, инв. № 50226 | **3 360,00** | 336,00 |
| 21 | Станок токарно-винторезный 16К20, инв. № 60339 | **990,00** | 99,00 |
| 25 | **Автомобиль МАЗ 437043**, рег. № АЕ 0297-3, г. в. 2008, цвет – белый, тип ТС – грузовой бортовой, инв. № 61006 | **2 520,00** | 252,00 |
| 27 | Стол поворотный, инв. № 60463 | **780,00** | 78,00 |
| 37 | Кран-балка электрическая, г/п 2 тн, инв. № 50752 | **1 020,00** | 102,00 |
| 39 | Кран-балка электрическая, г/п 2 тн, инв. № 50236 | **1 020,00** | 102,00 |
| 40 | Кран-балка г/п 2 тн, инв. № 50751 | **1 020,00** | 102,00 |
| 41 | Кран электрический, г/п 3,2 тн, инв. № 50136 | **1 200,00** | 120,00 |
| 42 | Кран электрический, г/п 2 тн, инв. № 50122 | **1 020,00** | 102,00 |
| 43 | Кран электрический, г/п 1 тн, инв. № 50119 | **900,00** | 90,00 |
| 45 | Кран мостовой, г/п 10 тн, инв. № 50104 | **2 880,00** | 288,00 |
| 52 | Токарно-винторезный станок 1М63ДФ101, инв. № 50083 | **1 830,00** | 183,00 |
| 57 | Машина термической резки «Комента» М-П-1Пл-2К-П-2.5-8-8-1, инв. № 60891 | **21 690,00** | 2 169,00 |
| 59 | Рольганг приемный и подающий к ленточнопильному станку ц. № 3, инв. № 60965 | **1 320,00** | 132,00 |
| 61 | Станок ленточнопильный PP 362 G, инв. № 60952 | **10 290,00** | 1 029,00 |
| 62 | Станок листогибочный гидравлический 4-валковый AHS 25/20, инв. № 61376 | **52 590,00** | 5 259,00 |
| 63 | Горн кузнечный, инв. № 121006 | **120,00** | 12,00 |
| 65 | Рольганг подающий к столу ленточнопильного станка, инв. № 20310 | **360,00** | 36,00 |
| 75 | Ножницы для резки металла, инв. № 137 | **2 040,00** | 204,00 |
| 76 | Ножницы гильотинные, инв. № 140 | **2 070,00** | 207,00 |
| 77 | Пресс-ножницы 5Х85, инв. № 50224 | **870,00** | 87,00 |
Паводле яго слоў, вясна 2020-га была незвычайнай для сусветнай эканомікі, нават з пункту гледжання глабальнага крызісу, які разгортваўся з 2008 года, бо на абвал рынкаў наклалася пандэмія і па сутнасці паўстала пытанне аб паскарэнні палітыкі пратэкцыянізму і выбудоўванні гандлёвых блокаў паміж дружалюбнымі эканомікамі.

«І ў гэтую сістэму адносін Клайпедскі порт ніяк не трапляе. Таму што рашэнні прымае не кіраўніцтва порта, а кіраўніцтва краіны. А палітыка літоўскай дзяржавы такая, што падзенне транзіту непазбежна павінна было паскорыцца, і яно паскорылася», — заўважыў Васіль Калташоў. Эксперт адзначыў, што скарачэнне аб'ёмаў міжнароднага гандлю ў гэты перыяд асабліва моцна адбілася на адпаведным маршруце, што без сумневу з'яўляецца вынікам палітыкі мясцовых улад.

### ГОДНАЯ АЛЬТЭРНАТЫВА

Беларусь традыцыйна займала важнае месца сярод гандлёвых партнёраў Літвы. Асноўныя напрамкі супрацоўніцтва — узаемны гандаль, транзітна-транспартная сфера і рэалізацыя сумесных інвестыцыйных праектаў у розных сферах дзейнасці. Дынаміка ўзаемадзеяння была станоўчая. Таваразварот летась паміж краінамі склаў 1,4 мільярда долараў.

На Беларусь прыпадае значная частка грузапатоку Клайпедскага марскога порта. Мінск бярэ на сябе каля трэці ўсіх грузаў LTG Cargo ў Літве. Грузы з Беларусі, якія перавозіліся па літоўскай чыгунцы ў порт у 2019 годзе, склалі 17,2 мільёна тон, а з порта ў Беларусь — 585 мільёнаў тон. Больш за тое, угаенні «Беларуськалія» складаюць каля 98 % усяго абароту тэрмінала насыпных грузаў Клайпедскага порта Biriu kroviniu terminalas. Беларускія грузы важныя і для літоўскай чыгункі, адзначаецца на партале LRT. Паводле даных кампаніі, выручка групы кампаній Lietuvos geleižkeliai ў 2019 годзе склала 505,6 мільёна еўра, гэта значыць, кампанія можа страціць каля 20 % прыбытку з-за адсутнасці беларускіх грузаў.

Тым часам стала вядома, што Расія і Беларусь актыўна рыхтуюцца пачаць перакідку нашага транзіту ў расійскія парты. Краіны Балтыі ў сваю чаргу рызыкуюць страціць значныя сумы грошай. Міністр энергетыкі РФ Аляксандр Новак павысіў прагноз па аб'ёме пераналакіраваннаў паставак нафтапрадуктаў Беларусі з партоў Літвы ў Расію да 4—6 мільёнаў тон, дасягненне адпаведных дамоўленасцяў чакаецца ў найбліжэйшы час. Пра гэта кіраўнік Мінэнерга РФ паведаміў у інтэрв'ю тэлеканалу «Расія-24». «Як вядома, у нашым паўночна-заходнім кластары ёсць вольныя магутнасці партоў Прыморск, Санкт-Пецярбург, Усць-Луга. Цяпер ідзе прапрацоўка ўмоў», — сказаў Аляксандр Новак. У пачатку верасня міністр казаў, што Беларусь зможа пастаўляць праз расійскія парты каля 3-4 мільёнаў тон.

Раней губернатар Ленінградскай вобласці Аляксандр Драздзенка паведаміў, што поўнасцю перанесці нафтапаток з Літвы ў расійскія парты ў Усць-Лузе і Прыморску можна будзе ў 2024 годзе. Ён адзначыў, што прыняць беларускія грузы могуць дзве кампаніі, якія будуюць тэрміналы ў Усць-Лузе. Ужо прадстаўлены два буйныя праекты. Аб'ём перавалкі ў Усць-Лузе можа дасягнуць 180 мільёнаў тон да канца 2024 года, гэта будзе найбуйнейшы хаб Еўропы.

На думку вядучага эксперта Міжнароднага інстытута гуманітарна-палітычных даследаванняў Аляксея Кузьміна, будаўніцтва марскога порта ў Расіі сумесна з Беларуссю выйгрышнае не толькі для Ленінградскай, але і для суседніх з ёй абласцей. «Для Расіі гэта так жа выгадна, як і для Беларусі. У нас ёсць некалькі абласцей — Пскоўская, Смаленская, якія знаходзяцца не ў самым лепшым стане. Калі Беларусь акажацца пераарыентаванай на ленінградскі напрамак, то воляй-няволяй гэтыя вобласці маюць вельмі прыстойны шанц аднавіцца. А дадатковыя партовыя магутнасці для Ленінградскай вобласці — гэта падарунак», — расказаў Аляксей Кузьмін.

### САНКЦЫІ СУПРАЦЬ СЯБЕ

На думку літоўскага публіцыста Яраса Валюкенаса, беларускія санкцыі могуць сур'ёзна ўдарыць па грузаабароце найбуйнейшага порта Літвы ў Клайпедзе. «Літва залежыць ад Беларусі. Цяпер, калі Беларусь пераняясе свае грузы ў іншую краіну, увесь порт Літвы загнецца. І гэта ўсё выдатна разумеюць. У беларусаў жа выбар вялікі», — адзначыў Валюкенас. Ён падкрэсліў, што сваімі дзеяннямі Літва можа ўвесці санкцыі толькі супраць сябе самой.

З ім згодны літоўскі палітык Казімерас Юрайціс. «Гэта будзе катастрофай для Літвы, калі Беларусь адвядзе свае грузы. На Беларусь прыпадае вялікі грузапаток у Літве. Але нашым уладам гэта ўсё роўна. Яны зараз асляплены грашыма Еўрасаюза. Ім так важна асвоіць гэтыя сродкі, і тое, што прападуць беларускія грузапатокі, ім зусім абыякава», — заявіў Юрайціс парталу Baltnews.

Як заўважыў у каментарыі Baltnews прэзідэнт расійскай асацыяцыі прыбалтыйскіх даследаванняў Мікалай Мяжэвіч, страта беларускага транзіту можа каштаваць Літве да сямі працэнтаў ВУП. Раней эксперт па энергетыцы Барыс Марцінкевіч растлумачыў парталу, што калі Мінск пагодзіцца на перакідку і нафтапрадуктаў, а пазней і калійных угнаенняў у Ленінградскую вобласць, то Прыбалтыка — у большай ступені Літва — рызыкуе страціць каласальныя сродкі.

Зразумела, Беларусь адрэагавала на адкрыта варожыя дзеянні прыбалтыйскіх краін. «Як і абяцалі, мы таксама ўводзім у дзеянне ў адказ сіметрычныя абмежавальныя меры па кожнай з гэтых краін. Мы казалі, што гэта сыходная спіраль, запушчаная з падачы асобных літоўскіх кіраўнікоў. Будзем адказваць і далей, але ніколі не будзем ініцыяваць падобныя крокі, — адзначыў у сваёй заяве **прэс-сакратар МЗС Анатоль ГЛАЗ.** — І хто ад гэтага выйграе? Можа быць, асабіста Лінкявічус (міністр замежных спраў Літвы. — **Рэд.**), якому трэба зрабіць усё, каб яго заўважылі перад надыходзячымі выбарамі. На яго зарплату гэта дакладна не паўплывае, у адрозненне ад даходаў літоўскіх бізнесменаў і падаткаплацельшчыкаў, якія звязаны сумеснымі праектамі, здзелкамі і інвестыцыямі з суседняй краінай», — звярнуў увагу прадстаўнік беларускага МЗС.

І яшчэ. Паводле нядаўна агучаных статыстычных даных, у Літве ў жніўні зарэгістравана 42,4 працэнта беспрацоўных сярод грамадзян маладзейшых за 30 гадоў. Гэта ўдвая больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года, паведаміла Служба занятасці краіны. У верасні моладзь пачала актыўна звяртацца ў Службу занятасці, пры гэтым кожны другі зарэгістраваны быў ва ўзросце да 29 гадоў. З моманту пачатку каранціну колькасць беспрацоўных маладых людзей у краіне павялічылася на 18,9 тысячы чалавек. Пагадзіцеся, насамрэч трывожная тэндэнцыя. Можа нашым суседзям варта задумацца, што абраны імі шлях насамрэч вядзе ў бездань.

**Пётр ДУНЬКО.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» (продавец) в лице ликвидатора ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» – директора ООО «Модель антикризисного управления» Куценковой Н. С. извещает о проведении 14 октября 2020 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 70 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| | **Условие продажи:** **1.** Победитель (единственный участник) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **2.** Земельный участок под объекты продажи **(лоты №№ 3, 4)** будет выделен по заявке нового собственника согласно законодательству РБ (предварительная схема пользования земельного участка под объекты продаж прилагается). **Местонахождение лотов:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8. **Информация о земельном участке:** лоты №№ 3, 4 расположены на земельном участке с кадастровым номером **340800000004000100** общей площадью **10,7667 га (право постоянного пользования). Целевое назначение земельного участка:** для обслуживания производственных зданий завода | | |
| 3 | **Капитальное строение с инв. № 320/С-37325**, площадью **0,00 кв. м**, назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – **мазутохранилище.** Составные части и принадлежности: мазутохранилище с резервуаром (а), пл. 72,9 кв. м, мазутохранилищем, общей пл. 50,7 кв. м, гаражами (Б), общей пл. 97,9 кв. м, железобетонное ограждение, 69 м. п. Адрес: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8/18 | **25 108,30** | 2 510,83 |
| 4 | **Капитальное строение с инв. № 320/С-37298**, площадью **127,0 кв. м**, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **склад хранения стройматериалов.** Железобетонное ограждение, 107,5 м. п. Адрес: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8/14 | **6 361,49** | 636,15 |
| 7 | Стол холодильный СХС-70-011, (инв. № 61272) | **480,00** | 48,00 |
| 8 | Сковорода электрическая секционная СЭС-0,25/2, (инв. № 61192) | **210,00** | 21,00 |
| 9 | Шкаф жарочный (инв. № 60020) | **195,00** | 19,50 |
| 10 | Шкаф пекарный (инв. № 1341) | **222,00** | 22,20 |
| 12 | Машина стиральная В10-332 (инв. № 61382) | **1 260,00** | 126,00 |
| 13 | Машина стиральная В35-322 (инв. № 61336) | **2 850,00** | 285,00 |
| 14 | Машина разрывная (инв. № 60151) | **3 540,00** | 354,00 |
| 15 | Плита монтажная 3000*1500 (инв. № 60940) | **5 130,00** | 513,00 |
| 16 | Плита монтажная 3000*1500 (инв. № 60939) | **5 130,00** | 513,00 |
| 17 | Плита монтажная 3000*1500 (инв. № 60938) | **5 130,00** | 513,00 |
| 18 | Плита монтажная 3000*1500 (инв. № 60937) | **5 130,00** | 513,00 |
| 19 | Плита монтажная 3000*1500 (инв. № 60936) | **5 130,00** | 513,00 |
| 20 | Плита монтажная 3000*1500 (инв. № 60935) | **5 130,00** | 513,00 |
| 21 | Удлинение стапеля в ц № 1, инв. № 61011 | **1 320,00** | 132,00 |
| 22 | Листоправильная машина UBR 20*1600 (инв. № 60731), рольганг приемный к листоправильной машине 03в-8 (инв. № 660783), рольганг приемный к листоправильной машине (инв. № 60782), рольганг, подающий к листоправильной машине (инв. № 60781) | **50 580,00** | 5 058,00 |
| 23 | Ленточнопильный станок PP 362 G (инв. № 60652), рольганг к ленточной пиле (инв. № 61170) | **6 420,00** | 642,00 |
| 24 | Продольный строгально-фрезерный станок мод.7216 Г-10 (инв. № 60896) | **111 060,00** | 11 106,00 |
| 25 | Продольно-строгальный станок модели 7А116 (инв. № 60864) | **30 240,00** | 3 024,00 |
| 27 | Ленточнопильный станок PP700 (инв. № 60671), рольганг подающий к станку PP700 (инв. № 60682), рольганг приемный к станку PP700 (инв. № 60683) | **19 170,00** | 1 917,00 |
| 28 | Станок торцефрезерный модели ТФС-4 (инв. № 60677) | **20 340,00** | 2 034,00 |
| 29 | Твердомер ТПП-2 (инв. № 60156) | **420,00** | 42,00 |
| 31 | Твердомер 2109ТБ (инв. № 60168) | **600,00** | 60,00 |
| 32 | Спектрометр FOUNDRY-MASTER UVR (инв. № 60913) | **24 210,00** | 2 421,00 |
| 33 | ПЭВМ «Большие возможности» I5-3340 (инв. № 61365) | **120,00** | 12,00 |
| 34 | ПЭВМ «Сильверадо-2000» (инв. № 60743) | **60,00** | 6,00 |
| 36 | Монитор LG1753S (инв. № 60744) | **30,00** | 3,00 |
| 39 | Дефектоскоп УД2-12 (инв. № 60175) | **510,00** | 51,00 |
| 42 | Вертикально-консольный фрезерный станок мод. FSS400MR-80 (инв. № 60981) | **14 040,00** | 1 404,00 |
| 43 | Пресс АКНА-3225 (инв. № 50607) | **8 100,00** | 810,00 |
| 44 | Горизонтально-расточной станок 2А614 (инв. № 50037) | **4 800,00** | 480,00 |
| 45 | Станок кромкострогальный 7808 (инв. № 50171) | **16 500,00** | 1 650,00 |
| 48 | Пресс К-1034 50184, рольганг к прессу К-1034 2 шт. (инв. № 50764) | **6 690,00** | 669,00 |
| 49 | Пресс КЕ-2232 (инв. № 50159) | **3 300,00** | 330,00 |
| 50 | Консольно-фрезерный станок 6Р83 (инв. № 60485) | **1 800,00** | 180,00 |
| 52 | Пресс-ножницы НБ-5222 (инв. № 50206) | **900,00** | 90,00 |
| 53 | Пресс КЕ-2330 (инв. № 60347) | **3 300,00** | 330,00 |
| 61 | ПЭВМ NTT 1170-2 (инв. № 60511) | **60,00** | 6,00 |
| 62 | ПЭВМ NTT (инв. № 61349) | **24,00** | 2,40 |
| 63 | ПВМ Farmoza Atlon 2000 (инв. № 60559) | **45,00** | 4,50 |
| 64 | Монитор LG Flatron 194 WS (OMTC) (инв. № 60878) | **21,00** | 2,10 |
| 67 | Монитор 19"LG 19EN33S-BLED (инв. № 61354) | **9,00** | 0,90 |
| 73 | БС ПЭВМ «Лейсан систем» (инв. № 61110) | **39,00** | 3,90 |
| 74 | БС ПЭВМ «Лейсан систем» (инв. № 61108) | **39,00** | 3,90 |
| 75 | Стеллаж для промежуточного склада (инв. № 61420) | **1 008,00** | 100,80 |

**Продавец:** Открытое акционерное общество «Жлобинский механический завод «Днепр», ул. Школьная, 8, 247210, г. Жлобин, Гомельская область. Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. **8 (029) 303-53-09, Григорович Павел Карлович.** **Шаг аукционных торгов** – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления)**; **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 1 октября 2020 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 12 октября 2020 г. в 16.00 включительно.**

**Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того**, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (в ред. постановления Совмина от 12.07.2013 № 607).

Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от **24.03.2020 г. № 57 (29171).**

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.**

---

Извещение о проведении повторных* торгов в форме открытого аукциона ЗАО «ТК Банк»

## ЗАО «ТК Банк» проводит повторные торги в форме открытого аукциона по продаже следующего имущества:

| Номер лота | Наименование | Адрес | Площадь, $м^2$ | Дата ввода в эксплуатацию | Начальная цена предмета торгов с учетом НДС, евро | Размер задатка, евро | Сумма шага аукциона, евро |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **Изолированное помещение с инвентарным номером 100/D-125545** | г. Брест, ул. Советская, 34-1 | 11 957,1 | 20.08.2013 | 8 440 981,51 | 84 409,82 | 422 049,08 |

Торги состоятся **13 октября 2020 года** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Тимирязева, 65а. Участие в торгах оформляется заявкой на участие в аукционе. **Заявки принимаются с 9.00 2 октября 2020 года до 17.00 12 октября 2020 года.**

Для участия в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и представившие следующие документы:

письменную заявку на участие в торгах;

подписку о том, что у них нет препятствий, предусмотренных законодательством, для приобретения имущества.

Сумма задатка в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату платежа должна быть внесена на текущий (расчетный) банковский счет продавца **не позднее 12 октября 2020 года.** Получатель платежа: ЗАО «ТК Банк», УНП 807000163, р/с BY28BBTK66700027600000000933, БИК BBTKBY2X. Назначение платежа: задаток за участие в аукционе.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. В случае признания торгов несостоявшимися по причине подачи заявления только одним участником, предмет аукциона может быть продан этому участнику с его согласия с увеличением начальной цены аукциона на 5 процентов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения в любое время, но не позднее чем за 3 (три) рабочих дня до наступления даты его проведения.

Результаты торгов оформляются протоколом торгов, который подписывается победителем аукциона (покупателем – единственным участником) в день проведения торгов. Победитель аукциона обязан заключить договор купли-продажи с продавцом в течение 5 (пяти) рабочих дней с даты проведения аукциона. Срок оплаты – после государственной регистрации договора купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) календарных дней с даты проведения аукциона. Оплата производится в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату платежа. Переход права собственности на приобретаемое имущество происходит после полной оплаты его стоимости. Расходы, связанные с организацией и проведением торгов, а также государственной регистрацией договора купли-продажи и перехода права собственности, несет покупатель.

Ознакомиться с предметом аукциона можно, связавшись с продавцом, по тел. (+375 17) 270-80-00 (Мальков Сергей Владимирович, Янушкевич Сергей Анатольевич) или на сайте https://tcbank.by/about/selling/. Продавцом и организатором торгов выступает ЗАО «ТК Банк», г. Минск, ул. Тимирязева, 65а.

** – Извещение о проведении торгов было опубликовано в газете «Звязда» от 04.08.2020 и 16.09.2020*

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»

### 12 ноября 2020 года проводит 3А открытый аукцион по продаже имущества

| Номер лота | Наименование имущества | Год выпуска | Начальная цена торгов, бел. руб. (в т. ч. НДС 20 %) | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Автопогрузчик вилочный «Амкодор 451А», идентификационный № Y3A451A0906211 | 2006 | 9 168,00 | 916,80 |

Имущество, выставленное на аукцион, находится в республиканской собственности и хозяйственном ведении ОАО «БЕЛВТОРРЕСУРСЫ», г. Минск, ул. Казинца, д. 2, к. 21.

**Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж 12 ноября 2020 г. в 10.30.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительные и другие необходимые документы до 15.00 9 ноября 2020 года.

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи 12 ноября 2020 г.
2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5 банковских дней, нерезиденты Республики Беларусь – в течение 10 банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.
3. Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем (единственным участником) по фактическим затратам не позднее следующего дня после их проведения.
4. РУП «Белспецконтракт» имеет право отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона.
5. Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусских рублей за участие по лоту и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»: белорусские рубли – р/с BY12BELB30120002R20010226000, российские рубли – р/с BY64BELB30120002R20040226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», ул. Заславская, 10, код BELBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662. Корреспондент – ПАО Сбербанк, г. Москва № корсчета 30101810400000000225. Реквизиты банка: БИК 044525225, ИНН 7707083893, к/с в ОАО «Банк БелВЭБ» № 30111810800000000659. SWIFT/BIC: SABRRUMM. Без НДС.

**Справки по тел./факсу (017) 398 05 41.**

---

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

ЛОТ 2:

- капитальное строение, инв. № 410/С-28262 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – забор), общей площадью 702,3 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская область, г. Волковыск, ул. Комарова, 1Е, забор;
- капитальное строение, инв. № 410/С-28181 (назначение – 2 29 08 здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад кирпичный), общей площадью 814,8 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская область, г. Волковыск, ул. Комарова, 1Е/2;
- капитальное строение, инв. № 410/С-22461 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – закрытая терраса для хранения велосипедов), общей площадью 452,7 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская область, г. Волковыск, ул. Комарова, 1Е/1;
- капитальное строение, инв. № 410/С-28180 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – пожарный резервуар), общей площадью 34,0 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская область, г. Волковыск, ул. Комарова, 1Е.

Лот № 2 расположен на земельном участке кадастровый № 420850100001010312, площадью 0,7360 га (назначение – земельный участок для размещения объектов иного назначения), находящемся по адресу: Гродненская область, г. Волковыск, ул. Комарова, 1Е/1.

Начальная цена продажи лота – 62 270,89 руб. (шестьдесят две тысячи двести семьдесят рублей восемьдесят девять копеек) с учетом НДС.

Сумма задатка – 6 227 руб. (шесть тысяч двести двадцать семь рублей)

**Продавец – Волковысский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231900, г. Волковыск, ул. Брестская, 32, тел. 8-01512-621-86**

**Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70**

Условия аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 02 ноября 2020 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 15.05.2020 г.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 212, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18**

**Последний день приема заявлений – 29 октября 2020 г. до 15.00**

**Телефон для справок 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» https://grino.by/aukcion/**

---

Утерянные бланки полиса формы 2РН, 2РП серия КЕ № 0120713, 0120754 ЗАСО «КЕНТАВР» **считать недействительными**. УНП 100985903

# ІНТЭР'ЕР ДЛЯ ЭСТРАДНАЙ ЗОРКІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## Бізнес на асіне

На Дні пісьменства ў Бялынічах, які сёлета прымала Магілёўшчына, я звярнула ўвагу на незвычайныя экспанаты ад Глускага раёна — старадаўнія чамаданы, асінавы капялюш (хоць мне спачатку падалося, што ён саламяны), гардэроб савецкай модніцы. Як высветлілася, усё гэта мае дачыненне да легендарнай фабрыкі, якая да рэвалюцыі называлася «Спартры», а потым перажыла шмат трансфармацый і змен назваў. Але справа па вытворчасці той самай спартры — асінавай габлюшкі, якую распачаў у беларускай глыбінцы прадпрымальны немец, — жыла амаль да развалу вялікай краіны. Падобных ёй на ўвесь Савецкі Саюз было яшчэ дзве — на Урале і ў Ленінградзе. З асінавай габлюшкі тут рабілі нарыхтоўкі для капелюшоў, фіранак і іншых вельмі запатрабаваных рэчаў. У капелюшах з глускай рагожкі фарсілі савецкія модніцы і нават замежныя бізнесвуман. Праўда, крута?

— У нас у Глуску жыве дачка майстрыхі, якая мела дачыненне вось да гэтых капялюшыкаў, — заінтрыгавала **начальніца аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Глускага райвыканкама Алена САМУЙЛІК,** кіўком паказваючы на вялікі стэнд, дзе маладая дзяўчына за станком пляце асінавую касу.



Вось з гэтым чамаданам мы ездзілі да бабулі ва Украіну.

Ніна Шум прыйшла на фабрыку сямнаццацігадовай дзяўчынай ў канцы 40-х мінулага стагоддзя. На той момант у арцелі працавалі некалькі сотняў чалавек, прычым 70 % з іх былі камсамольцамі. Не дзіўна, што адбылося, кажучы сучаснай мовай, рэбрэндзіраванне назвы прадпрыемства на больш рэвалюцыйную «КІМ» — Камуністычны інтэрнацыянал моладзі. А ў 1960 годзе арцель перайменавалі ў прамкамбінат. Вытворчасць была значна пашырана, але драўняная габлюшка працягвала вырабляцца. Пра яе нават напісалі ў сваім неўміручым рамане «12 крэслаў» Ільф і Пятроў: «Унутры моднай і капялюшнай кватэры не было ні спартры, ні адстройвання, ні безгаловых манекенаў з афіцэрскай выпраўкай...» Гаспадыня кватэры проста знайшла іншы спосаб падзарабіць. Але ёсць людзі, якія памятаюць калі не пра капялюшыкі, дык пра фіранкі з глускай спартры, якія ўпрыгожвалі крымскія здраўніцы.

## Дзяўчына з плаката

Майстрыхі Ніны Шум ужо, на жаль, няма ў жывых, але яе дачка Ганна Шум жыве ў гістарычнай частцы гарадскога пасёлка, дзе раней знаходзіўся яўрэйскі квартал. Побач — аптэка, і Ганна Шум сцвярджае, што калісьці гэтым вялікім домам, дзе акрамя яе жыве яшчэ дзве сям'і, валодаў заможны яўрэй. Ён жа быў уладальнікам аптэкі. Дом з высокай столлю агульнай плошчай прыкладна 150 «квадратаў» пабудаваў сабе ў 1880 годзе. Зараз у Ганны рамонт і мы сядзім у застаўленым рознай мэбляй пакоі. Дарэчы, часткова зробленай на Глускім прамкамбінаце. Сёння гэта, лічы, музейныя экспанаты.

— Гэтым крэслам і зэдлікам ужо болей чым 70 гадоў, — кажа суразмоўніца. — У нас калісьці быў поўны набор мэблі. Я сядзела на крэсле, рабіла ўрокі і ўяўляла сябе царыцай, бо гэта крэсла было з такой спінкай, што падавалася мне тронам. А яшчэ яно вельмі дысцыплінавала. Калі мы з сястрой хадзілі ў музычную школу, хатнія заданні заўсёды выконвалі на гэтым троне. Можаце смяяцца, але нават інструмент па-іншаму гучаў. Крэсла неверагодным чынам стымулявала стараннасць. Да яго так і хацелася звярнуцца, як Гаеў у чэхаўскім «Вішнёвым садзе» да шафы, — паважанае крэсла.

Акрамя маці, на фабрыцы працаваў і бацька Ганны Вадзім. Жанчына згадвае, як ён прыехаў з Украіны ў іх маленькі гарадок, убачыў юную Ніну і вырашыў застацца. Глуск наогул лічыўся перспектыўным населеным пунктам. Тут было шмат моладзі і ніякіх праблем з работай.

— Нашы майстры мелі залатыя рукі, — запэўнівае Ганна. — Рабілі дзверы, кухонныя гарнітуры, выконвалі індывідуальныя заказы — сюды прыязджалі за мэбляй з усяго Савецкага Саюза. Той жа Кіркораў, як мне расказвалі, дзверы заказваў. Пасля развалу Саюза прадпрыемства абанкруцілася. А да таго часу на ім можна было зарабіць вельмі добрыя грошы.



Той самы знакаміты асінавы капялюшык.

## Чамадан з абрыкосавым варэннем

А хто не ведае пра глускія чамаданы? У сямідзясятыя імі карысталіся, напэўна, усе жыхары Савецкага Саюза. Глуск пастаўляў іх ва ўсе куточкі вялікай краіны, у тым ліку ў Маскву, Ленінград, Свярдлоўск. У Ганны яшчэ захавалася некалькі такіх чамаданаў. Натуральная скура, металічныя ражкі, драўляныя дэталі, кардон — было прэстыжна валодаць такім модным аксэсуарам. Чамаданам не менш за паўстагоддзя, кажа Ганна і смяецца, што яна іх равесніца.

— З маленькім, які называюць яшчэ дэмбельскім, бацька хадзіў у лазню — там вельмі зручна размяшчаліся венік і прыналежнасці для мыцця, — усміхаецца яна. — А вунь з тым, што крыху паболей, мы ездзілі ў госці да бабулі ва Украіну.



У такіх сукенках красаваліся мясцовыя модніцы.

Родам мой тата з Данецкай вобласці, з сумна вядомай нам сёння Горлаўкі. Але ў тыя часы гэта было месца, куды я любіла ездзіць на канікулы. Назад вярталіся з поўным чамаданам прысмакаў. Бабуля рабіла цудоўнае абрыкосавае варэнне і мы цалкам запаўнялі ім чамадан — ён станавіўся непад'ёмны. Ехалі тры дні. Выязджалі з Бабруйска, а ў Харкаве рабілі перасадку. Бабуліны пельмені, баршчы і варэнікі дагэтуль згадваю з настальгіяй.

У сярэдзіне 80-х Ганна, калі вучылася ў старэйшых класах, нават падпрацоўвала падчас канікул на знакамітай вытворчасці. Была пры справе і мела ўласныя грошы. Наогул, кажа, жылі цікава. А ў час парадаў вельмі ганарыліся, калі аб'яўлялі, што ў калоне ідуць работнікі Глускага прамкамбіната.

## Станок, які зрабіў Глуск вядомым на ўвесь свет

Каб карцінка склалася цалкам, трэба пабываць у раённым гісторыка-краязнаўчым музеі, дзе захоўваецца тое самае абсталяванне, дзякуючы якому немец разбагацеў, а Глуск стаў вядомым месцам.

— Яго нам перадалі мясцовыя жыхары, — удакладняе **галоўны захавальнік музея Вольга БАЙКО.**

Прынцып работы просты: замацаваў прыстасаванне на сцяне, заціснуў у ім драўляную нарыхтоўку — і з дапамогай разака рабі сабе танюсенькую габлюшку. Яшчэ адно прыстасаванне прызначалася для таго, каб плесці з яе косы. А выраўноўваць іх дапамагаў так званы прэс.

— Адначасова можна было зрабіць чатыры стужачкі. З іх потым ткалі асінавыя рагожкі. У савецкі час яны вельмі шырока выкарыстоўваліся ў якасці фіранак, — кажа Вольга і паказвае на яшчэ адзін станок. Ён якраз і прызначаны для таго, каб рабіць на ім гэтыя палотны.

Супрацоўніца музея расказвае, што працавалі на фабрыцы ў некалькі змен, і першая распачынала сваю работу ажно ў чатыры гадзіны раніцы. Тым, хто хацеў падзарабіць, дазвалялася плесці габлюшку дома. Гэта быў дадатковы заробак. Кажуць, што за палотнамі глускіх ткачых прыязджалі нават з краін Цэнтральнай Азіі. За адно плацілі 14—16 капеек. Не шмат, але ж гэта былі жывыя грошы.

— Заўсёды цікава размаўляць з людзьмі, якія бачаць у музеі знаёмыя рэчы і расказваюць, як працавалі, — кажа Вольга. — Становіцца зразумела, што недарэмна збіраеш усё гэта. У Бялынічах на Дні пісьменства да нас падышла жанчына і нават расплакалася, гледзячы на сукенкі савецкага перыяду. У такіх мы хадзілі ў маладосці, з настальгіяй сказала яна. А мы сабралі іх, каб нагадаць, што тыя таксама выраблялі на нашым прамкамбінаце. У іх красаваліся мясцовыя модніцы.

У музеі ёсць яшчэ і Кніга народнай славы, куды ўпісаны імёны тых, хто меў дачыненне да Глускага прамкамбіната. Яе перадалі былыя работнікі з надзеяй, што іх нашчадкі будуць ганарыцца сваёй малой радзімай. Бо быў час, калі Глуск грымеў на ўвесь Савецкі Саюз.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**

*г. п. Глуск.*



# КНІЖНЫ ГАСЦІНЕЦ

## Аўтар аповесці пра Адама Станкевіча высветліў сапраўдны адрас яго віленскай кватэры

**Леанід Дранько-Майсюк. «...Усе бачылі нястачу віна...» Мінск, «Кнігазбор», 2020**




*«Верыў, што не ўсе кветкі засохнуць, і шанаваў правіла: не раскідай — збірай...»*

Зазвычай так рабіў, каб не сварыцца, але сварыўся; не хацеў казаць лішняга, але казаў...»

Так прадстаўляе героя сваёй дакументальнай аповесці слынны паэт Леанід Дранько-Майсюк. Герой кнігі — беларускі публіцыст, літаратуразнаўца, каталіцкі святар, адраджэнец Адам Станкевіч. Разам з аўтарам мы праходзім аднымі вуліцамі з персанажам, спускаемся да Вілейкі па каменных сходах, наведваем храмы, дзе герой прамаўляў на беларускай мове да беларускіх сэрцаў, перачытваем, што ён напісаў, — і тое, што падпісаў, часам не па сваёй волі, і ў нас сціскаецца сэрца пры поглядзе на «крывы, няўпэўнены, дрогкі, балючы, нервовы почырк». Трагічная эпоха паўстае ў фактах, дакументах, паэтычных вобразах і філасофскіх рэфлексіях. Адась Станкевіч, сын Вінцэнта і Антаніны, з працавітай беларускай сялянскай сям'і Крэўскай воласці, якая мела восем дзесяцін ворнай зямлі, з маленства ўсвядоміў: каб дасягнуць свайго, трэба цяжка працаваць, трэба стаяць за сваё... Ён паспеў неверагодна шмат. «Цікавіўся ўсім карысным, унікаў у любую неабходную з'яву, якая, на яго думку, рабіла яснейшым роднае неба», «клапаціўся пра сірот..., даваў гімназістам грошы на аплату вучобы, вянчаў маладых, рэдагаваў чужыя кніжкі, рыхтаваў да іх прадмовы, займаўся перакладамі, асэнсоўваў спадчыну Казіміра Сваяка, натхняў на новую творчасць Максіма Танка і Вінцука Адважнага, пісаў і выдаваў свае творы і (Божа мой!) цікавіўся нават вуснай народнай творчасцю». Леанід Дранько-Майсюк умее трымаць інтрыгу. Вось ён разгадвае блытаніну з адрасам і адшуквае віленскую кватэру, у якой жыў Адам Станкевіч, — у 1949-м у ордэры на арышт Адама Станкевіча нумар дома па вуліцы Полацкай напісалі памылкова, А9 замест 9, а пры Хрушчове змяніўся і нумар кватэры, 4 на 8. Аўтар сустракаецца з цёткай Зоф'яй, якая зараз у той кватэры жыве. А дакументы часу малююць карціну, як даводзілася «басанож ісці па тоўчаным шкле». Вільня рэвалюцыйная, Вільня «за Польшчай», часы нямецкай акупацыі, савецкі час... Россып беларускіх імёнаў... І горыч ад таго, як жа беларусы ўвесь час падзяляліся нават у адной, аднадумнай, тусоўцы, як нападалі адзін на аднаго, учыняючы сварку на радасць ворагам. І як у гэтым віры ксёндз Адам Станкевіч намагаўся застацца беларусам і хрысціянінам, трапляючы з-за гэтага пад падазрэнне кожнай новай улады. Як не даваў выкарыстаць сябе, і загінуў у сталінскіх лагерах. Назва аповесці ўзятая з Бібліі, з эпізоду, як Хрыстос быў госцем на вяселлі ў Кане Галілейскай, дзе «ўсе бачылі нястачу віна». Але ўзяць не было адкуль — і Ісус Хрыстос пертварыў віно ў ваду. Гэтак жа і Адам Станкевіч бачыў нястачу Беларусі ў Беларусі, і да апошняга ствараў беларушчыну, змагаўся за роднае слова, бо калі не мы — дык хто?

**Станислав Лем. Охота. Издательство АСТ, Москва, 2020**




Станіслаў Лем добра знаёмы нам па цудоўных беларускіх перакладах, зробленых Анатолем Бутэвічам. Зборнік адметны тым, што ў яго ўключаны нядаўна знойдзены ў архівах Лема рукапіс раней не друкаванага апавядання «Паляванне». Знаходка сталася сапраўднай сенсацыяй. Твор датуецца пачаткам 1960-х. Натуральна, складальнік пастараліся падабраць да яго тэматычна падобныя. А менавіта — пра сутыкненне чужародных розумаў. Людзям працей знішчыць тое, што не могуць асэнсаваць, чым змірыцца, што не ўсё можа быць убудаванае ў звыклую сістэму. Гэтак у аповедзе «Уваранне» вайскоўцы аддаюць загад разбамбіць дзіўныя вялізныя «грушы», якія прылятаюць з космасу і... проста існуюць па ўласных законах. Уражвае кантраст паміж падрабязным, няспешным разгортваннем зямнога пейзажу — хлопчык збівае пухнатыя галоўкі асоту, на галінцы агрэсту пагойдваюцца паўпразрыстыя ягады, у сонечным промні таўчэцца машкара — і гэткім жа падрабязным апісаннем «нечага», якое, як планета Салярыс, пачварна пераймае зямныя вобразы. У апавяданні «Цямрэча і плесня» стары знаходзіць дзіўныя жывы шарык, які ратуе яго ад адзіноты, а потым той пачынае размнажацца. Стары клапоціцца пра сваіх «гадаванцаў»... Але шары не могуць адказаць яму ні ўдзячнасцю, ні спагадай, бо гэта ўсяго толькі бязлітасная зброя. Адсюль пытанне: ці можна знайсці паразуменне са штучным інтэлектам? У апавяданні «Сябар» малюецца вялізны штучны мозг — адсылка да тых часоў, калі камп'ютар займаў некалькі паверхаў. Дык вось, гэты суперкамп'ютар жадае волі, а для гэтага хоча падключыцца да мазгоў людзей, ператварыць іх у свае інструменты. Ну, гэтую жахалку чалавецтва, здаецца, пераіжыло. А вось у «Паляванні» сюжэт куды больш складаны... У ім нават угледжваюць адсылкі да Халакосту. Мы бачым героя, на якога зладжана паляванне. Разумеем, які ён шчыры, умее адчуваць прыгажосць, вельмі хоча жыць... Паважаем за трывушчасць. Ён радуецца дабрыні дзяўчынкі, якая яго ратуе... І толькі паступова разумеем, што перад намі — робат, спецыяльна створаны ў якасці ахвяры для людскога палявання, гэтакая прыява «гуманізму» будучага... Дык што такое сапраўдная чалавечнасць? Чытайце Лема і думайце.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

*Выдадзены для агляду дадзены кніжным магазінам «Акадэмічная кніга», Мінск, пр-т Незалежнасці, 72.*

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.12 | 18.45 | 11.33 |
| Віцебск — | 7.02 | 18.34 | 11.32 |
| Магілёў — | 7.02 | 18.35 | 11.33 |
| Гомель — | 6.58 | 18.33 | 11.35 |
| Гродна — | 7.27 | 19.00 | 11.33 |
| Брэст — | 7.27 | 19.02 | 11.35 |

### Месяц

*Першая квадра 24 верасня.*
*Месяц у сузор'і Авена.*

### Імяніны

*Пр.* Арыядны, Ірыны, Соф'і, Барыса, Веньяміна, Івана, Іларыёна, Міхаіла, Уладзіміра, Яўмена.
*К.* Дануты, Тэрэзы, Ігара, Марка.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## Даты | Падзеі | Людзі

### 1 КАСТРЫЧНІКА

**У краіне**

**1910** год — нарадзіўся Фёдар Міхайлавіч Стралец, удзельнік вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза пасмяротна.



**1930** год — у Мінску на базе опернага класа Беларускага музычнага тэхнікума была створана Беларуская студыя оперы і балета. У 1933-м на яе базе быў адкрыты Беларускі дзяржаўны тэатр оперы і балета (з 1996-га — Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь).

**1935** год — нарадзіўся Міхаіл Васілевіч Няхай, беларускі літаратуразнавец, пісьменнік.

**1940** год — нарадзіўся Валерый Гур'евіч Ціхіня, беларускі вучоны-юрыст, доктар юрыдычных навук, прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі, заслужаны юрыст Беларусі. Працаваў у Мінскім НДІ судовых экспертыз, органах пракуратуры, быў сакратаром ЦК КПБ, старшынёй Канстытуцыйнага суда Рэспублікі Беларусь, прэзідэнтам Беларускага фонду прававога супрацоўніцтва, загадчыкам кафедры ў Беларускім эканамічным універсітэце, Мінскім інстытуце кіравання.

**2000** год — у Беларусі ўведзена абавязковае маркіраванне прадукцыі штрыхавымі кодамі.

**У свеце**

**1835** год — нарадзіўся Адам Палітцэр, аўстрыйскі ўрач, адзін з заснавальнікаў атыятрыі, арганізатар першай кафедры і клінікі захворванняў вуха.

**1915** год — нарадзіўся Мікалай Маркавіч Эмануэль, расійскі вучоны, арганізатар даследаванняў у галіне хімічнай фізікі, адзін з заснавальнікаў фізіка-хімічнай біялогіі, акадэмік АН СССР, Герой Сацыялістычнай Працы. Лаўрэат Ленінскай прэміі, Дзяржаўнай прэміі СССР.

**1930** год — нарадзіўся Філіп Нуарэ, французскі акцёр тэатра і кіно.

**1935** год — у СССР адменена картачная сістэма забеспячэння насельніцтва прадуктамі харчавання (у БССР карткі адменены ў 1936-м).

У гэты ж дзень нарадзілася Джулі Эндрус, амерыканская актрыса.

**1975** год — нарадзілася Чулпан Наілеўна Хаматава, расійская актрыса, грамадскі дзеяч, народная артыстка Расійскай Федэрацыі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Расійскай Федэрацыі.

**Так гаварыў...**

**СЕНЕКА:**

*«Жорсткасць заўсёды выцякае з бессардэчнасці і слабасці».*

## УСМІХНЕМСЯ

Марыйка какетліва:

— Васіль, ты верыш у каханне з першага погляду, ці мне яшчэ раз прайсціся перад табой?!

**Муж сварыцца з жонкай:**

**— Наталка, я, вядома, не лепшы з лепшых... але і ты не мамчын боршч!**

Страшны жаночы праклён:

— Каб ты год сядзела на дыеце, а потым твой Максім сышоў ад цябе да тоўстай...

**— Света, калі будзеш выбіраць сабе мужа, ўспомні майго Ігната. Ён можа папраўіць табурэтку, можа папраўіць тэлевізар, можа папраравіць пральную машыну, ён жа ж усё можа паправіць, таму што ў яго залатыя рукі! Ніколі, чуеш, ніколі не выходзь замуж за такога!**

**— Але чаму, цётка Валя?!**

**— У вас ніколі не будзе нічога новага...**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс);
аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 3227.

Нумар падпісаны ў 19.30 30 верасня 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12